ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 23 (4275)
Чацьвер, 28 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Зьезд аднадушна ўхваліў палітычную лінію ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы справаздачны даклад тав. КАЛІНІНА аб рабоце ЦКК КП(б)Б за час з XIII зьезду КП(б)Б, XIV зьезд КП(б)Б прызнае палітычную лінію ЦКК правільнай і праведзеную работу здавальняючай

Перамога генэральнай лініі партыі

XIV зьезд КП(б)Б аднагалосна ўхваліў палітычную лінію і работу ЦК КП(б)Б.

Гэта пастанова зьяўляецца яркім паказальнікам **ленінскага адзінства радоў КП(б)Б, бальшавіцкай згуртаванасьці яе вакол свайго Цэнтральнага Камітэту.**

XIV зьезд КП(б)Б праводзіць свае работы па ўмовах, калі Савецкі Саюз, неадлучнай часткай якога зьяўляецца БССР, знаходзіцца на подступах да другой пяцігодкі, закліканай вырашыць гістарычную задачу канчатковай ліквідацыі капіталістычных элементаў у нашай краіне, задачу пабудаваньня бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. База для вырашэньня гэтай задачы падрыхтавана тымі грандыёзнымі перамогамі генэральнай лініі партыі, з якімі прышла УсеКП(б) пад кіраўніцтвам свайго ЦК на чале **з тав. Сталіным** да заключнага году пяцігодкі.

Пэрыяд часу, які адзяляе нас ад XIV зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б, знамянуе сабою бліскучае пацьвярджэньне аналізу міжнароднага становішча і пэрспэктыў будаўніцтва сацыялізму ў СССР, даных правадыром партыі тав. Сталіным у палітычнай справаздачы XVI партзьезду.

«Найлюбейшы крызіс у краінах капіталізму—вярнейшы довад падыходзячага крушэньня капіталістычнага сьвету. Посьпехі сацыялізму ў СССР—лепшы довад пераваг сацыялістычнай сыстэмы перад сыстэмай капіталістычнай» (тэзісы па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава).

Справаздача ЦК КП(б)Б па XIV зьезьдзе зьяўляецца разгорнутым паказам пераможнага шляху, пройдзенага КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК УсеКП(б) за апошнія дваццаць месяцаў.

Тав. Шаранговіч у сваім дакладзе разгарнуў шырокі малюнак найвялікшых сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія адбыліся ў БССР—у мінулым адсталай прычэпанай акраіне раманаўскай імпэрыі.

Савецкая Беларусь ператварылася ў аграрна-індустрыяльную краіну, узброеную магутнай пераробкавай тэхнікай, перабудоўвае сельскую гаспадарку ў напрамку разьвіцьця буйнога сацыялістычнага земляробства. У Савецкім Саюзе завершана набудова фундамэнту сацыялістычнай эканомікі.

Лічбы росту народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі зьяўляюць сваёй дынамічнасьцю. Яны ў радзе выпадкаў значна перавышаюць агульнасаюзныя паказьнікі. Тут з усёй выразнасьцю сказваецца **рэзультат ленінскай нацыянальнай палітыкі, брацкая дапамога БССР з боку Савецкага Саюзу.**

Павялічэньне за год на 69 проц. прамысловай валавой прадукцыі! 51,7 проц. удзельная вага прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы! Калгасьнік—цэнтральная фігура земляробства! Перавыкананьне пяцігодкі па цэлым радзе галін народнай гаспадаркі! Буйнейшыя посьпехі культурнай рэвалюцыі!

Вось кароткія, але выключнай важнасьці вынікі барацьбы КП(б)Б за набудову сацыялізму.

Гэтыя перамогі—перамогі генэральнай лініі партыі, непрымірымай барацьбы КП(б)Б па два фронты, супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да іх. Гэта—рэзультат паслядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, рашучай барацьбы КП(б)Б з усілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з ухілам у бок беларускага і іншых мясцовых шавінізмаў.

КП(б)Б на чале са сваім Цэнтральным Камітэтам была і ёсьць надзейным атрадам бальшавіцкай партыі, моцнай апорай ленінскага ЦК УсеКП(б) у яго барацьбе за ленінізм, супроць апартунізму, супроць контрэвалюцыйнага трацкізму і гнілога лібэралізму.

КП(б)Б на-бальшавіцку правяла барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, разгромила яго, ачысьціла ад нацыянал-апартуністычных элементаў свае рады.

Няўхільна расьце і мацнее аўтарытэт партыі ў найшырэйшых масах рабочае клясы і працоўных. Лепшыя з лепшых ударнікі сацыялістычнай будоўлі бязупынна паваўняюць рады партыі. КП(б)Б за паўтары гады вырасла на 17.000 чалавек.

Нашы посьпехі вялікія. Але ёсьць яшчэ і буйныя хібы.

Недавыкананьне прамысловасьцю ў 1931 г. свайго прамфінпляну, значныя недахопы ў рабоце па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў—**у гэтым цэнтральным, карэнным пытаньні калгаснага будаўніцтва,**—недавыкананьне плянаў па с.-г. загатоўках—гэта павінна прыкаваць да сябе ўвагу ўсёй партыі, мабілізаваць усе сілы на рашучае павышэньне тэмпаў і якасьці работы.

Трэба пішчэй перабудавацца, каб па ўсіх участках сапраўды пачаць «па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць». Гэта складаная задача. Але яе неабходна ва што-б там ні стала поўнасьцю вырашыць. Для гэтага, перш за ўсё, патрэбна барацьба з правяхоўным, ліквідацыйным падыходам да значэньня перабудовы кіраўніцтва.

Першы сакратар ЦК КП(б)Б **тав. Гікало** ў сваёй прамове на XIV зьезьдзе завастрыў на гэтым пытаньні ўвагу ўсёй КП(б)Б. Ён таварыў:

«Некаторыя зразумелі задачу працаваць па-новаму так, што запісалі, расьпісаліся, пастанавілі і што ўсё будзе зроблена... Але, калі мы разьбіраем сутнасьць пастаноўкі пытаньня тав. Сталіна, то выходзіць, што працаваць па-новаму — гэта такая справа, якую нельга праводзіць самацёкам, што працаваць па-новаму—гэта значыць, што трэба не на словах, а сапраўды на справе праводзіць генэральную лінію партыі, што працаваць па-новаму—гэта значыць трэба павысіць тэмпы сваёй работы, што працаваць па-новаму—гэта, перш за ўсё, трэба наглядзець на якасьць работы, што працаваць па-новаму—гэта значыць увайсьці ў сутнасьць справы, гэта значыць аўладаць тэхнікай... Працаваць па-новаму—гэта значыць працаваць не наогул, а канкрэтна, разглядаючы кожнае паасобнае канкрэтнае пытаньне, працаваць па-новаму—гэта значыць апэрацыйна працаваць, а працаваць апэрацыйна—гэта, перш за ўсё, значыць кіраваць не з габінэту, а бываць на мясцох, бачыць жыцьцё пачыма бальшавіка... Работа па-новаму мае на ўвазе праверку на месцы, гэта значыць праверку выкананьня... Работа па-новаму азначае, каб працаваць ня замкнута, не ізаляцыя, а на аснове разгорнутай пралетарскай унутрыпартыйнай самакрытыкі. Гэта значыць, што трэба ў рабоце праводзіць прынцыповасьць, а не бясспрынцыпнасьць. Гэта азначае, што трэба змагацца з фразай, з гаварыльнай. Вось што азначае, таварышы, працаваць па-новаму».

Ажыцьцявіць гэтыя ўказаньні тав. Гікало—задача ўсіх партарганізацый.

Больш увагі і практычнай дапамогі нізавой партыйнай ячэйцы — гэта аснова асноў нашай партыйнай арганізацыі!

Больш увагі пытаньням рабочага быту, паляпшэньню культурных і матар'яльных умоў рабочае клясы, як адной з важнейшых прадпасылак пасьпяховага выкананьня прамфінпляну!

Задачы, якія стаяць перад намі—вялікія і адказныя. Але няма і ня можа быць сумненьня, што яны будуць вырашаны поўнасьцю.

Генэральная лінія нашай партыі вызначае шляхі пабудаваньня сацыялізму. Гістарычныя 6 умоў тав. Сталіна—вострая зброя нашай практычнай штодзённай барацьбы.

Са сьцягам Леніна ў непрымірымым змаганьні з усімі ўхіламі ад бальшавізму, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б), на чале з тав. Сталіным, мы з посьпехам заверным пяцігодку за чатыры гады, забясьпечым пераможнае ўступленьне ў другое пяцігодзьдзе, якое знамянуе сабой вялізарнейшую гістарычную эпоху чалавецтва.

Ад рэдкамісіі XIV зьезду КП(б)Б

Гэтым паведамляецца, што без санкцыі рэдакцыйнай камісіі зьезду ніякія стэнаграфічныя матар'ялы (апрача жывой запісі) друкавацца ня могуць.

Рэдакцыйная Камісія.

Апошнія навіны з фронту індустрыялізацыі

Новая электрастанцыя ў Кузбасе

На Пракопаўскім рудніку пушчана магаможная электрастанцыя магутнасьцю ў 3000 кілёват. Электрастанцыя будзе абслугоўваць Пракопаўскі і Кісялёўска-афонінскі вугальны раёны. Пуск электрастанцыі поўнасьцю ліквідуе крызіс ў электраэнэргіі на Пракопаўскім руднику.

Новы дахавы матар'ял—сфагношыфэр

ЛЕНІНГРАД. Пад Ленінградам пачынаецца набудова першага ў СССР заводу па вырабе агнятрывалага дахавага матар'ялу — сфагношыфэру, які замяняе жалеза і толь. Поўная магутнасьць заводу — 1 млн. кв. мэтр. матар'ялу ў год. Кошт будаўніцтва — 1.200.000 руб.

66 тыс. тон бляхі

ДНЕПРА-ПЯТРОЎСК. Прыступлена да рэканструкцыі цэху заводу «Камінтэрн», які вырабляе белую бляху для кансэрвовай прамысловасьці. У выніку рэканструкцыі, якая будзе скончана ў жніўні г. г., завод будзе штогод выпускаць 66 тыс. тон белай бляхі замест 17 тыс. тон, выпушчаных у 1931 г.

Рост чыгуначнай сеткі ў СССР

20 студзеня адкрыўся рух на лініі Новасібірск — Ленінск даўжынёй у 295 клм. Новая лінія забясьпечвае вывоз вугалю з Кузьнецкага басэйну. Апрача лініі Новасібірск — Ленінск, у бліжэйшыя тыдні ў эксплёатацыю ўступіць рад новых ліній, агульнай адлегласьцю звыш 1.100 клм., у тым ліку лінія Кізэль — Чалябінск у 504 клм., Омск — Чалябінск — у 400 клм.

XIV зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

Вячэрняе пасяджэньне 26-га студзеня

На авансцэне дэлегацыі навуковых работнікаў, рабочых заводу імя Ланцуцкага, настаўнікаў, замежных спэцыялістаў. Рабочы і прафэсар, нямецкі спэцыяліст і беларускі настаўнік—прышлі перадаць сталёвай кагорце КП(б)Б — XIV зьезду — шчырае пралетарскае прывітаньне.

— Мы падпараджаем усю навуковую работу генэральнай лініі партыі, паставім навуковыя дасягненьні на службу сацыялізму — гаворыць прафэсар **Мелкіх.**

— Чырвонасьцяжнае настаўніцтва Савецкай Беларусі аддана змагалася за краіну сацыяльнай пісьменнасьці. Яно і надалей будзе змагацца за новыя, больш шырокія па размаху і глыбокія па зьмесьце заваяваньні культурнай рэвалюцыі, — запэўнае зьезд дэлегат ад менскай канфэрэнцыі настаўніцтва т. **Ляхоўскі.**

На трыбуне тав. **Клюге** — намоцкі спэцыяліст.

— Год таму назад у гэтай самай залі, вітаючы зьезд саветаў, мы абяцалі зрабіць усё магчымае для свайго часовага, поўнага, пуску і пасьпяховай работы электрычнай фабрыкі штучнага валакна Сельня з гонарам заяўляем XIV зьезду: набудова закончана, фабрыка з посьпехам працуе. Разам з беларускімі рабочымі мы перамаглі. Тут, у Савецкім Саюзе, кожная машына, якою ўладае і кіруе пралетар, працуе на карысьць сусьветнай рэвалюцыі. Там, у Нямеччыне, фабрычны варштат, якім уладае капітал, паднявольвае чалавека. Тут вялізарнымі тэмпамі ідзе будаўніцтва сацыялізму, там яшчэ большымі тэмпамі ідзе запішваньне і заміраньне капіталізму. Няхай жыве камуністычная партыя! Няхай жыве т. Сталін! — канчае сваю прамову т. **Клюге.**

— Ад імя двух з паловай тысяч рабочых заводу імя Ланцуцкага падніцтвам КП(б)Б, дасягнула вялікіх перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва. У мінулым краіна забітая, няпісьменная, прыдушаная ботам царскага самаўладзтва, Беларусь, пры пралетарскай дыктатуры, разам з братэрскімі савецкімі рэспублікамі пераможна ідзе наперад да сацыялізму.

Паклаўшы ў аснову сваёй работы **6 умоў т. Сталіна,** КП(б)Б атрымала перамогі ў разьвіцьці прамысловасьці.

У выніку адданай работы чырвонасьцяжнага настаўніцтва мы сталі краінай сацыяльнай пісьменнасьці. Навука ў капіталістычных дзяржавах скарыстана для прычэпчаньня працоўных мас, навука ў нас служыць перамогам сацыялізму. Большасьць навуковых работнікаў, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, разам з намі працуе над сацыялістычнай рэканструкцыяй прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Другая пяцігодка забясьпечвае ліквідацыю клясаў, пабудову сацыялістычнага грамадзтва. Барацьба за пяцігодку, гэта той вузел, якога якога канцэнтруюцца ўсе сусьветныя пытаньні. Прыехаўшыя да нас замежныя спэцыялісты ператвараюцца ў шчырых прыхільнікаў Савецкага Саюзу. Яны ня хочуць варочацца назад. Яны застаюцца, каб разам з намі весьці барацьбу за канчатковую перамогу сацыялізму.

***

Працягваюцца спрэчкі па дакладу Заходняй Беларусі, што калі польскі імпэрыялізм адважыцца напасьці на Савецкі Саюз, мы супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны ваяваць ня пойдзем. Мы зброю накіруем супроць імпэрыялізму, ператворым вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую. (Бурныя воплескі).

Унас застаецца адзіны выхад — пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы і Заходняй Беларусі. З крызісу толькі адзіны выхад — пралетарская рэвалюцыя (бурныя воплескі).

Тав. **Будзінскі** агалашае прывітальную тэлеграму, якая атрымана ад ЦК КПП... Дэлегаты ўстаюць, пяюць «Інтэрнацыянал». Зьезд пасылае адказную прывітальную тэлеграму ЦК КПП і КПЗБ.

У канцы пасяджэньня заслухана заключнае слова т. Шаранговіча.

— У спрэчках выступіла 60 дэлегатаў, запісалася 120. Зьезд паказвае вялізарную актыўнасьць, рост, маналітнасьць і згуртаванасьць КП(б)Б вакол ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі т. Сталіна. Зьезд уносіць новую старонку ў разьвіцьці Савецкай Беларусі. У далейшай рабоце трэба палепшыць апэрацыйнае кіраўніцтва, адмовіцца ад фразы. Няма нічога больш шкоднага, чым голая фраза. Пад дэкларацыйным фразэрствам часта захоўваецца самы горшы від апартунізму. Яшчэ больш разгарнуць крытыку і самакрытыку, устанавіць большую адказнасьць за даручаную справу. Давайце-ж і надалей па-бальшавіцку змагацца і дабівацца новых перамог у сацыялістычным будаўніцтве.

Зьезд прызнаў палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай і ўхваліў практычную работу за час з XIII па XIV зьезд.

ГРУПА ДЭЛЕГАТАЎ МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РАЗАМ З Т. Т. ГІКАЛА І ГАЛАДЗЕДАМ

Няхай жыве КПП! — разносіцца воклічы дэлегатаў зьезду.

— Таварышы! Ад працоўных Заходняй Беларусі, ад працоўных Польшчы братэрскае агнявое прывітаньне XIV зьезду КП(б)Б!

— Пралетары ўсяго сьвету пільна сочаць за сацыялістычным будаўніцтвам СССР. Ваша барацьба на два фронты падае новыя сілы, новую энэргію для КПЗБ. Перамогі Савецкай Беларусі былі магчымы толькі таму, што вы працуеце разам з рабочай клясай СССР, самай рэвалюцыйнай клясай усяго сьвету, толькі таму, што вамі кіруе ленінскі ЦК і лепшы ленінец — т. **Сталін.**

Зусім у іншых умовах працуем мы. У нас пануе тэрор, шыбеніцы фашысцкага ўраду. Большасьць рабочых беспрацоўныя. Хто працуе, той атрымлівае галодны паёк. Кормяцца бульбай, дый яе не хапае. У вёсцы налічваецца ня менш 1 мільёна беспрацоўных. Узмацняецца [illegible] прычэпчаньне. Усе беларускія школы закрыты. За адну прыналежнасьць да рэвалюцыйнага нацыянальна-вызваленчага руху — рабочы і селянін атрымлівае 8 год катаргі. Рабочыя і сяляне пераконваюцца, што так жыць больш нельга. Мы і яны — так паўстае пытаньне. У вас роскіт, у іх — загніваньне. Чым больш мацнее Савецкі Саюз, тым больш упэўненасьці ў рабочых Захаду.

Запэўняю ад імя рабочых і сялян Заходняй Беларусі, што мы будзем ісьці ў Савецкі Саюз, ісьці ў Савецкую Беларусь, ісьці ў Савецкую Украіну, ісьці ў Савецкі Саюз, ісьці ў Савецкі Саюз.

Ранішняе пасяджэньне 27 студзеня

На шостым пасяджэньні зьезд заслухаў даклад тав. **Калініна** аб рабоце Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі КП(б)Б.

Аспэўным, — гаворыць тав. **Калінін,** — што пранізвала ўсю дзейнасьць ЦКК, зьяўлялася і зьяўляецца барацьба за адзінства радоў нашай партыі, за генэральную лінію, супроць скажэньняў і апартунізму ўсіх масьцей.

Правы апартунізм знаходзіць сваё выяўленьне ў пасаваньні перад труднасьцямі у пажаданьні рухацца высокімі тэмпамі, і г. д. За апошні час ЦКК выкрыла буржуазна-рвацкія тэндэнцыі, якія выяўлены ў асобных зьвеньнях савецкага апарату і некаторых калгасах.

Гэтыя тэндэнцыі найбольш яркі праявіліся ў складаньні збожжавых балянсаў па радзе саўгасаў.

ЦКК жорстка ўдарыла па гэтых праяўленьнях. Дэлегатам зьезду вядомы тыя арганізацыйныя меры, якія ўжыты ЦК і ЦКК да дырэктараў асобных саўгасаў і кіраўніцтва Белсаўгастрэсту.

ЦКК разам з усёй партарганізацыяй вяла таксама непрымірымую барацьбу з «лявацкага» парадку скажэньнямі лініі партыі, якія выяўляліся больш за ўсё ў адміністраваньні і давядзеньні цьвёрдых заданьняў да серадняка.

У рабоце КП(б)Б, г. зн. і ў дзейнасьці ЦКК, у цэнтры ўвагі заўсёды стаяла задача настойлівага, пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ЦКК КП(б)Б выкрыла цэлы рад фактаў вялікадзяржаўнага шавінізму і мабілізавала КП(б)Б на барацьбу з ухілам у бок гэтага шавінізму, як галоўнай небясьпекай на даным этапе. Вялікадзяржаўніцтва знайшло сьлёд праяўленьне, галоўным чынам, у супраціўленьні ў паасобных зьвеньнях апарату беларусізацыі, у пагардлівых адносінах да беларускай мовы і «дробязей» нацыянальнай культуры, у недаацэнцы дырэктыў партыі аб разгортваньні нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Факты гэтага парадку досыць вядомы. Даволі напомніць об тым, што выяўлена ў часе абсьледваньня Віцебскай арганізацыі, аб імкненьнях ліквідаваць нацсаветы ў Чачэрскім раёне, аб выступленьні Вальфсона, Выцры і т. д.

Наша партыя, а разам з ёю і ЦКК, правялі і вядуць непрымірымую барацьбу з мясцовымі шавінізмамі (беларускі, польскі, яўрэйскі).

Ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку, нашы арганізацыі павінны ўзмацніць партыйнае, пралетарскае кіраўніцтва нацыянальна-культурным будаўніцтвам і шырэй разгарнуць, з большай настойлівасьцю праводзіць беларусізацыю апарату.

Тав. **Калін,** далей, спыняецца і шырока асьвятляе работу ЦКК і барацьбу ўсёй КП(б)Б за разгортваньне дзейснай бальшавіцкай самакрытыкі. Дакладчык падае цэлы рад фактаў грубога заціску самакрытыкі па радзе арганізацый, якія выкрыты органамі кантрольных камісій.

Спыніўшыся падрабязна на тых задачах, якія стаяць перад КП(б)Б у галіне барацьбы з усякімі скажэньнямі лініі партыі, і на задачах разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, тав. **Калін** перайшоў да другой часткі дакладу — да асьвятленьня работы ЦКК у галіне індустрыялізацыі БССР і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

— Органы кантрольнай камісіі адыгралі вялікую ролю ў барацьбе за высокія тэмпы прамысловага будаўніцтва, у барацьбе за ўзмацненьне энэргетычна-апалавай базы, за колькаснае і якаснае выкананьне прамфінпляну, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў і рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна.

Тав. Калін асабліва спыняецца на рабоце тых галін прамысловасьці, што працуюць на мясцовым сырцы.

— ЦКК ня раз займалася спэцыяльна пытаньнямі разьвіцьця і работы тарфяной прамысловасьці, якая выклала прамфінпляну усяго на 53 проц., і лясной, якая таксама значна недавыканала свайго пляну.

Работа гэтых важнейшых галін прамысловасьці павінна стаць зараз у цэнтры ўвагі работы як органаў КК, так і ўсёй партыйнай арганізацыі.

— Мы дабіліся буйнейшых посьпехаў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі, мы аб'ядналі больш паловы бядняцка-сераднякіх гаспадарак у калгасы. Гэта перамога гістарычнага значэньня. Але бальшавікам не ўласьціва захапляцца посьпехамі і «почивать на лаврах». Нашы калгасы гаспадарчы як сьлед не ўмацаваны. Партыйныя ячэйкі, сельсаветы далёка ня ўсюды па-бальшавіцку змагаюцца з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі асобных груп калгасьнікаў, ня ўсе яшчэ калгасы ачышчаны ад кулацкіх элементаў.

Партыйныя арганізацыі таму абавязаны развіць у шырокім сэнсе гэтага слова работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, паставіўшы на справе гэту задачу як цэнтральную ў дзейнасьці кожнай раённай арганізацыі, кожнай ячэйкі.

У заключнай частцы свайго дакладу тав. **Калінін** завастрыў увагу зьезду на неабходнасьці ўсямернага, штодзённага павышэньня авангардной ролі камуністаў незалежна ад таго, дзе-б, на якім-бы ўчастку ён ни працаваў.

***

Па дакладу тав. **Калініна** разгарнуліся спрэчкі. На ранішнім пасяджэньні выказаліся т. т. **Кузьелька** (Мазыр), Васюковіч (ЦКК), **Дзейка** (Гарадок), **Соскін** (Слуцак), **Хлеўнікаў** (Гомель), **Лазоўсні** Дрыса).

АБ ПРАПРАЦОЎЦЫ ТЭЗІСАЎ XVII ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ УсеКП(б)

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б,

ЦК КП(б)Б, надаючы вялізарнае палітычнае значэньне пытаньню давядзеньня тэзісаў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) да кожнага члена і кандыдата партыі, да кожнага камсамольца, рабочага і калгасьніка, прапануе ГК і РК КП(б)Б і фракцыям прафсаюзаў зараз-жа разгарнуць шырокую масавую прапрацоўку гэтых тэзісаў шляхам правядзеньня наступных мерапрыемстваў:

1. Ва ўсіх партячэйках і ячэйках ЛКСМБ як ў гарадох, так і на вёсцы склікаць печарговыя сходы для сталай прапрацоўкі тэзісаў XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б), надрукаваных у цэнтральных і беларускіх газэтах. ГК і РК КП(б)Б забясьпечыць даклады падрыхтаванымі, вытрыманымі дакладчыкамі.

2. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б і фракцыям прафсаюзаў склікаць агульныя сходы на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, у апорных пунктах на вёсцы (сельпарткомы) з пастаноўкай даклягу аб тэзісах XVII партыйнай канфэрэнцыі, высьвятляючы іх сусьветнае гістарычнае значэньне. Скарыстаць таксама абсьценьня перапынкі для масавай работы вакол гэтай работы. Правядзеньне ўсёй гэтай работы забясьпечыць вытрыманымі, падрыхтаванымі работнікамі.

3. Культпропу ЦК КП(б)Б забясьпечыць шырокае асьвятленьне ў цэнтральным, гарадзкім, раённым і нізавым друку тэзісаў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б), мабілізуючы масы на выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, узмацняючы яшчэ большую актыўнасьць рабочае клясы і калгасьнікаў, узьнімаючы на вышэйшую ступень самакрытыцтва і ўдарніцтва.

4. Беларускаму Кіраўніцтву Сувязі, пад асабістую адказнасьць т. т. **Дубіны** і **Шушкевіча,** і Беларускаму, пад адказнасьць тав. **Галкіна,** забясьпечыць шырокае скарыстаньне радыёвяшчаньня і кіно для мабілізацыі мас вакол пытаньняў, высунутых тэзісамі XVII партыйнай канфэрэнцыі. Культпропу ЦК прагледзець за якасьцю гэтай работы (напярэдні прагляд, вызначэньне і інструктаваньне дакладчыкаў і інш.).

5. Для правядзеньня дакладаў па прадпрыемствах Менску камандыраваць наступных дэлегатаў зьезду: т.т. Галадзеда, Кавальчука, Рыкова, Бэнэка, Хлеўнікава, Судакова, Тамашэўскага, Гантмана, Грысевіча, Турлая, Хацкевіча, Балціна, Міцькова, Рачыцкага, Гарунавіча, Іванова, Рыскіна, Аранштама, Гурэвіча (ЦКК), Ляўкова.

6. Ва ўсёй сетцы партыйнай асьветы (школы, гурткі, курсы) стала прапрацаваць тэзісы XVII-ай партыйнай канфэрэнцыі, гарнасам і райкомам забясьпечыць высокую якасьць гэтай прапрацоўкі.

7. Прапрацаваць тэзісы XVII-ай канфэрэнцыі ў школах сацыху па лініі выкладаньня грамадазнаўства.

8. Работа па тэзісах XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) павінна быць шчыльна зьвязана з шырокім растлумачэньнем ходу работ XIV-га зьезду КП(б)Б пад кутом працягу разгортваньня сам. самакрытыкі і ўдарніцтва прадпрыемствам, саўгасаў і калгасаў і МТС на правах партпрацаваць зьезду, дабіваючыся выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, усіх відаў загатовак, рэалізацыі 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, рашуча змагаючыся супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

ЦК КПП і ЦК КПЗБ

Кіраўніку надыходзячых рашучых баёў за польскі Кастрычнік, барацьбіту з крывавым фашызмам, правадыру нацыянальна-вызваленчай барацьбы супроць польскай акупацыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, загартаванаму ў падпольнай рабоце — Цэнтральнаму Камітэту брацкай Камуністычнай партыі Польшчы і Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі — XIV зьезд КП(б)Б шле палкае бальшавіцкае прывітаньне.

Дарагія таварышы! Да свайго XIV зьезду КП(б)Б прышла маналітна загартаваным атрадам бальшавікоў ленінцаў з вялікімі дасягненьнямі на шматлікіх франтох сацыялістычнай будоўлі. Савецкая Беларусь з поўкалёнай царскай Расіі ператвараецца ў індустрыяльна-аграрную краіну, маючы на сёньня ўжо амаль 100-тысячную армію фактычнага пралетарыяту.

Бядняцка-сераднякіня масы БССР даказалі сваю адданасьць справе сацыялізму, аб'яднаўшы дробна-ўласьніцкія гаспадаркі ў калгасы больш чым на 50 проц. У гэтай вялізарнай будоўлі працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей, пад кіраўніцтвам партыі, ідуць непахісьнымі радамі да новых перамог над сьцягам Леніна.

Пад гэтым-жа сьцягам яны, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ствараюць сваю культуру нацыянальную па форме і пралетарскую па зьместе, вядуць барацьбу за ператварэньне БССР у гэтым-жа годзе ў краіну сацыяльнай пісьменнасьці.

Пралетары і працоўныя беларускай, польскай, яўрэйскай, літоўскай і латыскай нацыянальнасьцей паказваюць лепшыя ўзоры творчага энтузіязму ў справе будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі і сваёй нацыянальнай культуры. Яны ствараюць сваю пралетарскую нацыянальную культуру на рубяжы з крайнай фашызму, з крайнай шыбеніц і палявых судоў, з крайнай голаду і нацыянальнага прыгнечаньня.

Ва ўсёй гэтай барацьбе і будаўніцтве мы ні на хвіліну не забываем таго, што наша работа ёсьць частка агульна-пралетарскай барацьбы за сусьветны Кастрычнік. За нашу работу, за кожны посьпех у ёй і за кожны недахоп мы адказваем і перад пралетарамі Польшчы і пралетарамі Заходняй Беларусі, якія пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ рыхтуюцца да апошніх баёў з капіталам, з крывавым фашызмам, з акупацыяй, польскім імпэрыялізмам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Нас натхняе ўсьведамленьне таго, што наша будаўніцтва ёсьць база сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, наша будаўніцтва абумоўлена неадрыўнай сувязьзю з нашай барацьбой супроць прыгнятальнікаў, якім вы наносіце ўдар за ўдарам, зрываючы ажыцьцяўленьне іх імпэрыялістычных плянаў.

Памятаючы аб супольнай барацьбе польскага, беларускага і яўрэйскага пралетарыяту супроць панаў і капіталістаў у часы царызму, праводзячы барацьбу за справу Леніна, пад кіраўніцтвам Камінтэрну, у апошнія часы, — мы разам з вамі ідзем уперад да новых перамог, да сусьветнага Кастрычніка пад сьцягам Леніна, пад сьцягам Камінтэрну.

Гэты наш шлях вызначае ленінізмам, як перадавой рэвалюцыйнай гэорыяй, за якую мы вядзем непрымірымую барацьбу супроць правага апартунізму, «левага» ўхілу, супроць контр-рэвалюцыйнага трацкізму, супроць вялікадзяржаўнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі; супроць мясцовага шавінізму, супроць нацыянал-апартунізму і прымірэнцтва. У гэтай барацьбе ліст правадыра партыі і Камінтэрну тав. Сталіна зьяўляецца вострай зброяй у руках партыі.

Пад кіраўніцтвам Камінтэрну і правадыра міжнароднага пралетарыяту тав. Сталіна мы ідзем на шляху да свайго Кастрычніка, у непрымірымай бязьлітаснай барацьбе супроць ідэалізацыі люксамбургізма і меншавіцкіх традыцый «НПС-лявіцы», за лінізм, сьцяг якога вы з гонарам прапесьцё да сусьветнага Кастрычніка.

Няхай жыве Камінтэрн — правадыр сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту — т. Сталін!

Няхай жыве Кастрычнік Польшчы і Заходняй Беларусі!

Няхай жыве баявы атрад Камінтэрну—Камуністычная партыя Польшчы!

Няхай жыве Камуністычная партыя Заходняй Беларусі — правадыр барацьбы за сапраўднае і нацыянальнае вызваленьне працоўных мас Заходняй Беларусі!

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Справаздача Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА)*

VII. Барацьба за ленінскую нацпалітыку і посьпехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва

Пераходжу да пытаньняў нацыянальна - культурнага будаўніцтва. Я падаваў ужо факты, якія сьведчаць аб вялізарных дасягненьнях сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР. Гэта ёсьць лепшы довад правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі. Кожны завод, кожная фабрыка, кожны саўгас і калгас, якія мы будуем, азначаюць адначасова практычнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

У нацыянальна - культурным будаўніцтве мы дасягнулі найвялікшых посьпехаў. Даволі ўказаць, напрыклад, на нашы дасягненьні на фронце ліквідацыі няпісьменнасьці. У 1924-25 г. ліквідавана няпісьменнасьць 39 тыс. чал.; у 1929-1930 г.—235 тыс., а ў 1931 г. ліквідацыя няпісьменнасьці было ахоплена 211 тысяч чалавек. Мы ставім сваёй мэтай да мая 1932 году поўнасьцю ліквідаваць няпісьменнасьць, дабіцца таго, каб БССР стала рэспублікай суцэльнай пісьменнасьці.

Савецкая Беларусь першая з усіх саюзных рэспублік узяла ўсеагульнае навучаньне. Цяпер 96 проц. дзяцей ахоплены школамі. Значна пашырылася сетка вышэйшых навучальных устаноў. У 1921 годзе мы мелі адну вышэйшую навучальную ўстанову, а ў 1930-31 г.—26 ВНУ, у якіх навучалася 5.955 чал. У 1926-27 г. мы мелі 36 тэхнікумаў, а цяпер—65. У 1921-22 г. у БССР было ўсяго 2 рабфакі, а ў 1930-31 г.—24.

Пяцігадовы плян культурнага будаўніцтва мы перавыконваем па ўсіх галінах.

У сувязі з гэтым трэба некалькі спыніцца на ўстаноўках контр-рэвалюцыйных нацдэмаў у пытаньнях культурнага разьвіцьця Беларусі. Нашы клясавыя ворагі — нацдэмы ўсімі сіламі прабавалі затрымаць і сарваць тэмпы культурнага разьвіцьця БССР, як і на іншых участках сацыялістычнага будаўніцтва. Нацдэмаўская пяцігодка культурнага разьвіцьця БССР меркавала правесьці ўсеагульнае навучаньне для дзяцей ва ўзросьце ад 8 да 11 год толькі ў 1933 г., а мы гэта навучаньне ўвялі ў 1929 г. Нацдэмы намячалі ахапіць навучаньнем у самогіках у 1933 г. усяго 25 проц. дзяцей, а мы ў 1933 г. ахопім усе 100 процантаў дзяцей. Асабліва цікавы лічбы, зьвязаныя з павышэньнем матар'яльна-бытавога становішча настаўніцтва. Нацдэмаўская цяпігодка меркавала давесьці ў 1933 г. зарплату настаўніцтва да 67 руб. 50 к., а мы ўжо да 1932 г. фактычна давялі гэту зарплату да 88 р. 41 кап. Вось якую праграму намячалі нацдэмы, якія гаварыліся, што яны зьяўляюцца, так сказаць, «сацыяльнымі абаронцамі» на фронце культурнага будаўніцтва.

Партыя, стварыўшы свае пралетарскія кадры, ідзе наперад на шляху пераможнага культурнага разьвіцьця і будзе надалей бязьлітасна змагацца з контр-рэвалюцыйнай тэорыяй і практыкай нацыянал-дэмакратаў, з іх варожымі ўстаноўкамі. Партыя атрымала і атрымае яшчэ большыя перамогі ў будаўніцтве культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па сваім зьместе. Наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б разграміла нацдэмаўскую контр-рэвалюцыю, разьбіла нацыянал-апартуністаў — агентуру нацдэмаў у радах КП(б)Б і з яшчэ большымі посьпехамі азыцыяўзьяўляе задачы культурнай рэвалюцыі, рашуча і пасьлядоўна праводзячы ў жыцьцё ленінскую нацыянальную палітыку.

А зараз некалькі слоў аб сутнасьці нацыянальнага пытаньня. Галоўнае ў ленінізме, як вядома, ёсьць не сялянскае пытаньне (да якога трацкісты зводзілі ленінізм, абмяжоўваючы яго нацыянальнымі рамкамі), а дыктатура пралетарыяту, часткай чаго і зьяўляецца нацыянальнае пытаньне. Тав. Сталін у сваім лісьце ў рэдакцыю «Пролетарской революции» піша:

«Але, ці ня сьледуе з гэтага, што руская рэвалюцыя была (і застаецца) вузлавым пунктам сусьветнай рэвалюцыі, што карэнныя пытаньні рускай рэвалюцыі зьяўляліся разам з тым (і зьяўляюцца цяпер) карэннымі пытаньнямі сусьветнай рэвалюцыі».

Адным з вузлавых пытаньняў сусьветнай рэвалюцыі і зьяўляецца нацыянальнае пытаньне. Марксыцка-ленінскі тэзіс самаазначэньня нацый аж да аддзяленьня мабілізаваў і мабілізуе на барацьбу супроць імпэрыялізму і фашызму мільённыя масы рабочых і сялян і шматмільённы рэзэрв сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, якія знаходзяцца ў прыгнечаных краінах і калёніях.

У сувязі з гэтым выключнае палітычнае значэньне набывае высунутая тав. Сталіным у сваім лісьце праблема ўзмацненьня барацьбы з люксэмбургізмам. Бальшавікі павінны дамбока зывучаць ленінскую крытыку памылак Р. Люксэмбург.

БССР зьяўляецца яркім узорам ленінскай нацпалітыкі. Пралетарыят БССР у саюзе з аснаўнымі масамі сялянства, пад кіраўніцтвам КП(б)Б і УсеКП(б), пры брацкай дапамозе пралетараў і працоўных усяго Савецкага Саюзу, ператварыў Беларусь з былой царскай калёніі ў фарпост сацыялістычнага будаўніцтва на рубяжы з капіталістычным Захадам.

КП(б)Б, няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацпалітыку ў барацьбе на два фронты, супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць мясцовага нацыяналізму і ўсякіх скажэньняў ленінскай нацпалітыкі, — дабілася найвялікшых перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Тав. Сталін ў сваім лісьце ў рэдакцыю «Пролетарская революция» вывіў перад нашай партыяй самыя асноўныя, самыя вузлавыя праблемы бальшавізму, сярод якіх важнае месца займае і нацыянальнае пытаньне. Люксэмбургізм стаў ня толькі адмаўленьнем ленінскіх асноў нацыянальнай палітыкі падчаняецца зараз контр-рэвалюцыйнымі трацкістамі і да таго падобнымі рэнэгатамі камунізму, якія ў сваёй барацьбе супроць сусьветнага бальшавізму выкарыстоўваюць зброю з арсэналу Р. Люксэмбург. Ленін на працягу многіх год вёў жорсткую барацьбу з устаноўкамі люксэмбургізма ў нацыянальным пытаньні. Ленін указваў, што «Р. Люксэмбург сваім адмаўленьнем права на аддзяленьне ў праграме расійскіх марксыстаў дапамагае на справе чорнасоценцам—вялікарусам» (том XIX, ст. 112). Ленін таксама ўказваў, як «вялікарускія чорнасоценцы зусім сьвядома падтрымаюць забабоны Р. Люксэмбург і расхвалюць іх» (там-жа, стар. 113).

Ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту пры пераможным сацыялістычным будаўніцтве, пры ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі, вялікарускія шавіністы карыстаюцца ў сваёй барацьбе супроць дыктатуры пралетарыяту зброяй люксэмбургізму, якое адмаўляе ленінскую нацпалітыку. Такую-ж адчайную работу праводзяць у капіталістычных краінах трацкісты і іншыя рэнэгаты ў барацьбе супроць камуністычных партый.

Атака супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі азначае таму і атаку супроць аднаго з важнейшых прынцыпаў ленінізму, супроць адзінства стратэгіі і тактыкі пралетарскай рэвалюцыі, супроць адзінства фронту пралетарскай рэвалюцыі і рэвалюцыйна-вызваленчага руху прыгнечаных народаў і калёній.

У барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку КП(б)Б ня раз прыходзілася перамагаць факты ідэалізацыі люксэмбургізма з боку некаторых таварышоў як у мінулым, калі яны пратыпастаўлялі ленінізму ідэі Р. Люксэмбург, так і ў цяперашні момант, калі пасобныя таварышы ўзводзяць Р. Люксэмбург у правадыры пралетарскай рэвалюцыі, памылёншыка прынізаючы ролю Леніна да практыка рэвалюцыі. Гэта знайшло сваё адлюстраваньне і ў апошніх дні ў фактах нельзяшчкі ліста тав. Сталіна газэтай «Орка».

КП(б)Б не палітыка аслабляць барацьбы за ленінізм і на гэтым вучастку. Мы павінны ў духу ленінскіх установак шырэй разгарнуць крытыку люксэмбургізмства, даючы рашучы адпор усякім спробам яго ідэалізацыі.

Асаблівую ўвагу ўсяе КП(б)Б павінна зьвярнуць на ўзмацненьне барацьбы з меншавіцкімі трацкістамі Бунду, з ідэалізацыяй яго мінулага. Трэба не аслабляць гэтай непрымірымай барацьбы, якую КП(б)Б вядзе на працягу ряду год.

Ленін ня раз указваў, што бундаўцы ў аснову сваёй нацыяналістычнай праграмы «нацыянальна-культурнай аўтаноміі» паклалі памылкі Р. Люксэмбург. Ленін пісаў, што «відаць нідзе ня на гэты раз Р. Люксэмбург аказалася ў сумнай кампаніі п. п. Сямкоўскіх, Лібмана і Юркевіча» (т. XIX, ст. 130). Ленін называў бундаўцаў наклёпніцтвам Лібмана, «апартуністычнымі пашлепчыкамі» Р. Люксэмбург. Уладзімер Ільліч таксама ўказваў: «Р. Люксэмбург нельга, вядома, прыраўноўваць да Лібмана, Юркевічаў і Сямкоўскіх, але той факт, што іменна падобныя людзі ўчаніліся за ле памылку, даказвае з асаблівай відавочнасьцю, у які апартунізм яна трапіла». Бундавец Лібман, апартуністычны пашлепчык Р. Люксэмбург, і ўсе падобныя да яго меншавікі, ліквідатары, нацыяналісты адмаўлялі такое самаазначэньне нацый аж да аддзяленьня і падмянялі яго нацыянальнай аўтаноміяй на выгаду яўрэйскай буржуазіі і рабінаў і служылі рускім лібералам. Гэта бундаўская праграма атрымала сваё агульнае прызнаньне на кіеўскім блёку ліквідатараў на чале з Троцкім.

На працягу ўсёй сваёй барацьбы КП(б)Б зьяўлялася бязьмным атрадам ленінскай УсеКП(б), які праводзіў ленінскую палітыку, змагаўся за ленінізм. Гэтым і толькі гэтым можна вытлумачыць, што КП(б)Б з такім посьпехам мабілізавала працоўных усіх нацыянальнасьцей на будаўніцтва сацыялізму, што КП(б)Б стварыла і ўзмацніла [illegible] ны брацкі саюз працоўных усіх нацыянальнасьцей БССР, саюз, які стварэ і ўвесь час узмацняецца на яго клясавай аснове. Непарыўнасьць гэтага клясавага адзінства мы бачым сёньня і на нашых фабрыках, дзе інтэрнацыянальныя брыгады рабочых паказваюць лепшы ўзоры працы і ў інтэрнацыянальных калгасах, дзе шматнацыянальны склад калгасьнікаў - ударнікаў паказвае добрыя прыклады клясавага адзінства, паважнага на творчы энтузіязм у справе сацыялістычнай перабудовы хутаркоў у мінулым Беларусі.

Правільнае праведзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі было зарукай усё ўзрастаючага ўзмацненьня саюзу працоўных Беларусі з працоўнымі ўсіх інш. саюзных рэспублік. Яркім пацьвярджэньнем гэтага зьяўляюцца самаадданая работа сормаўскіх рабочых на калгасных палёх БССР, перадача вопыту калгасьнікам Украіны, якія прыехалі на дапамогу калгасам Савецкай Беларусі, сацыялістычная праца беларускіх калгасьнікаў у капальнях Дагбасу і на Дняпрабудзе, на ленінградзкіх заводах і фабрыках і г. д. Гэта ўжо не пасобныя зьявішчы, а масавае-арганізаваныя мерапрыемствы, якія запраўды сьведчаць аб новым этапе ў разьвіцьці брацкага адзінства працоўных вызлікага Савецкага Саюзу.

КП(б)Б дабілася усіх гэтых посьпехаў у непрымірымай барацьбе з ухіламі ў нацыянальным пытаньні і прымірэньцтва да іх, перш за ўсё з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, нацыянал-апартунізмам, пазіцыямі — польскім, яўрэйскім і інш. У гэтай барацьбе КП(б)Б заўсёды выходзіла з ленінскай тэорыі, кіравалася ёю, як адзінай рэвалюцыйнай тэорыяй сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, як марксызмам эпохі імпэрыялізму, грамадзянскіх войнаў і пралетарскіх рэвалюцый.

Кіруючыся ленінізмам, КП(б)В выпраўляла і пасобныя памылкі, якія былі дапушчаны ў некаторых арганізацыях і ў адказ з пастановай XIII зьезду КП(б)Б (аб прафсаюзах), дзе давяўся лёзунг аб барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам, як галоўнай небясьпекай.

Указка ўсёй КП(б)Б зараз-жа пасьля XVI зьезду УсеКП(б) была накіравана на ажыцьцяўленьне пастановаў XVI зьезду, у якіх гаворыцца, што вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай, бо ён «ажыцьцяўляе асновы ленінскай нацыянальнай палітыкі і пад сьцягам інтэрнацыяналізму прыкрывае іменны адзьніваючых клас панавейшай раней вялікадзяржаўнай нацыі вінаваціць сабе страчаным прывілеі» (XVI зьезд УсеКП(б).

Ад сваёго XIII да XIV зьезду КП(б)Б ішла ў непрымірымай барацьбе з вялікадзяржаўнікамі, якія праявілі асаблівую актыўнасьць і, прыкрываючыся псэўда-лучэньнем разьвязаньняў, праявілі свае ўстаноўкі, перакідваючы на пасобных участках да адкрытых выпадкаў. Гэта актыўнасьць выявілася ў радзе выступленьняў, да найбольш яркіх з якіх трэба адносіць выступленьні Югава аб тым, што ў камуністаў-гісторыкаў ёсьць розныя падыходы да ацэнкі гістарычных фактаў: «Мы, вялікадзяржкія камуністы-гісторыкі, ацэньваем факты інакш, чым беларусы і украінцы—камуністы».

Меў месца падыход да крытыкі нацыянал-дэмакратызму не з партыйных пазыцый, а з пазыцый вялікадзяржаўнага шавінізму (Вальфсон, Выдра), што выхіляецца ў прыпісваньні нацыянальных форм культуры яе пралетарскаму зьместу, у разважаньнях аб перапазьяліваньні «асаблівасьцей» беларускай нацыі, у насьмешлівых і патарадлівых адносінах да раду «дробязей» нацыянальнай культуры, быту і інш. Зарэгістраваны факты адкрытага супраціўленьня беларусізацыі, асабліва ў часе праверкі становішча беларусізацыі савецкага апарату. Некаторыя работнікі выступалі з заявамі накшталт таго, что «белорусский язык грубый, я бы сказала, хамский язык» (Глуск, зад. кансультацыяй), што «все школы как национальные так и белорусские необходимо постепенно русифицировать» (Жыжэмскі, настаўнік Чудзін). Была, напрыклад, на пратаколе, напісаным на беларускай мове, рэзалюцыя падобнага зьместу: «протокол вести на русском языке, на других языках рассматриваться не будет» (сакратар Клічаўскага РВК). Мы мелі пмат іншых фактаў, якія гавораць аб актыўнасьці вялікадзяржаўнага шавінізму, напрыклад, вядомая яўна вялікадзяржаўніцкая вылазка на заводзе «Камунар» (Менск).

У барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку КП(б)Б ні на мінуту не аслабляла барацьбы з мясцовым нацыяналізмам, сутнасьць якога выразна ахарактарызавала тав. Сталіным:

«Сутнасьць ухілу да мясцовага нацыяналізму заключаецца ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, імкненьні затушаваць клясавыя супраціўнасьці ўнутры сваёй нацыі, у імкненьні абаранцца ад вялікарускага шавінізму шляхам адыходу ад агульнага патоку сацыялістычнага будаўніцтва, у імкненьні ня бачыць таго, што зблізка і яднае працоўныя масы нацыянальнасьцей СССР, і бачыць толькі тое, што моска іх аддзяляць адну ад другой».

На аб'яднаным пасяджэньні бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК у сьнежні 1931 г. былі падведзены некаторыя вынікі ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі і рашуча завострана ўвага ўсёй КП(б)Б на неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні. ЦК заклікаў усю партыйную арганізацыю «даць бязьлітасны адпор усякім спробам перагледзець або ацэньць палітыку партыі ў барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам. Пасьлядоўная і непрымірымая барацьба супроць нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму складае і ў далейшым важнейшую задачу ўсёй КП(б)Б. Бо нацыянал-дэмакратызм толькі разьбіт, ён атрымаў жорсткае паражэньне, але, як небясьпека, яшчэ ня зьнік. Нацыянал-дэмакраты і іх агенты ў радах партыі — нацыянал-апартуністы яшчэ робяць вылазкі на пасобных участках супроць партыі і яе ленінскай лініі. Першая часта гавораць: «партыя да беларусізацыі адносіцца, сьцісьціўшы рукавы» (Азаровак, Калгаспэнтр); «нацыянал-дэмакратычная «партыя» трохі лявей за бальшавіцкую»; «вялікадзяржаўны шавінізм—галоўная небясьпека, а б'юць нас, беларусаў» і г. д. і г. д. Іх твар зусім ясны. Другі-ж адбіваюць гэтыя настрої і больш утончаных формах. Адны гаворыць (Шчарбакоў), што рабочая кляса ў Беларусі да Кастрычніка была рэзэрвам рэвалюцыі. Адсюль ня трудна зразумець, што [illegible] аб [illegible], ня як аб пралетарскай рэвалюцыі.

Другі разводзіць «тэарытычную» балбатню аб двухзваннасьці КП(б)Б, даказваючы, што нібы КП(б)Б сваімі каранёнямі ўваходзіць ня толькі ў РСДРП(б), але і ў беларускую сацыялістычную грамаду (дробна-буржуазная нацыяналістычная арганізацыя) Трэці—самест ленінскай устаноўкі аб адрытным выкарыстаньні культурнай спадчыны імкнецца даказаць, што беларуская пралетарская культура ўваходзіць сваімі каранёнямі ў «залаты век» мінулага Беларусі. Пры гэтым ён наўмысьля замоўчвае тое, што «ў кожнай нацыянальнай культуры ёсьць хоць-бы нязьвыйтыя элемэнты дэмакратычнай і сацыялістычнай культуры, бо ў кожнай нацыі ёсьць працоўныя і эксплёатаваныя масы, умовы жыцьця якіх нараджаюць ідэалёгію дэмакратычную і сацыялістычную. Але ў кожнай нацыі ёсьць таксама культура буржуазная, у большасьці сваёй чорнасоценная, эксплёатарская. Гаму нацыянальная культура паогул ёсьць культура памешчыка, папоў, буржуазіі» (Ленін, том XIX). Яшчэ і да гэтай пары ёсьць спробы разглядець старую беларускую культуру «паогул», спробы прадставіць яе, як культуру прыгнечанай беларускай беднаты, адмаўляючы гэтым самае існаваньне кляс на Беларусі.

У пасобных выпадках мы нават мелі выступленьні такога характару, што «ў нацыянал-дэмакратаў ёсьць чаму павучыцца, што ў нацыянал-дэмакратаў ня ўсё дрэнна».

Разьбіты і скампрамэтаваны нацыянал-дэмакратызм і яго агенты ў радах партыі яшчэ будуць імкнуцца весьці пакёны на ленінскую нацыянальную палітыку і выступаць са ованімі варожымі «тэорыямі». КП(б)Б не на мінуту не аслабіць сваёй увагі і да падобнага роду варожых выступленьняў.

У сувязі з актывізацыяй клясавых варожых груп, выкліканай нашым рашучым і пасьпяховым сацыялістычным наступленьнем на ўсім фронце, мы маем факты актывізацыі варожых і чужых нашай партыі ідэалёгій, як ідэалізацыя Бунду і Грэмады (Майзель, Шагавалаў), ідэалізацыя люксэмбургізма і праяўленьне шавіністычных настрояў (Шчарбакоў і інш.). ЦК КП(б)Б вёў непрымірымую барацьбу з гэтымі ўхіламі і скажэньнямі нацыянальнай палітыкі партыі. Рад буйнейшых арганізацый (Менск, Гомель, Віцебск) праявілі таксама значную работу.

Да свайго XIV зьезду і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі КП(б)Б прыйшла ў разгорнутай барацьбе ня толькі супроць вялікадзяржаўнага шавінізму і беларускага нацыянал - дэмакратызму, але і супроць усялякіх іншых праяўленьняў шавінізму (яўрэйскага, польскага і інш.).

Накіроўваючы галоўны агонь на вялікадзяржаўным шавінізьме, ні ў якім разе ня трэба аслабляць барацьбы і супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых нацыянальнасьцей БССР, бо як вялікадзяржаўны расізкі, так і беларускі і інш. шавінізмы, зьяўляючыся контр-рэвалюцыйнай ідэалёгіяй варожай клясы, звычайна змыкаюцца ў барацьбе супроць камунізму, супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Характэрна, што і вялікарасійскія і беларускія шавіністы шалёна супраціўляюцца беларусізацыі, якая праводзіцца нашай партыяй. Во яны палохаюцца клясавага зьместу беларусізацыі, якая ўмацняе пралетарскае кіраўніцтва сялянствам і нацыянальна - культурнага будаўніцтва, узмацняе пазыцыі пралетарыяту ў барацьбе з клясавым ворагам і ў справе кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам.

Значныя посьпехі ў справе правядзеньня беларусізацыі не павінны асла блець работы партыйных арганізацый па вывучэньні беларускай мовы, культуры, эканомікі і быту, адначасова забясьпечваючы інтарэсы нацыянальных меншасьцей.

Ва ўсёй сваёй далейшай рабоце КП(б)Б павінна грунтавацца на ленінскіх установках у нацыянальнай эканамічнага ўзроўню БССР да ўзроўню перадавых рэспублік і абласьцей Савецкага Саюзу, у барацьбе за [illegible] беларускай [illegible] на фоне і пралетарскай па зьместе за ўмацненьне непарыўнага саюзу працоўных усіх нацыянальнасьцей, якія населяюць БССР, за яшчэ большае ўмацненьне саюзу працоўных БССР з працоўнымі ўсёй вялікай Савецкай краіны.

Наша задача — значна ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва на ўсіх участках культурнай работы і тэарытычнага фронту. Трэба палепшыць якасьць работы школ, тэхнікумаў, ВНУ і навукова-даследчых інстытутаў. Трэба на блізіць да мас Беларускую Акадэмію Навук, інстытут гісторыі партыі і г. д. Трэба ні на ні стала поўнай ліквідацыі алтеравіцьня ў галіне выпуску твораў Леніна на беларускай мове.

Трэба выдаць сапраўды бальшавіцкую гісторыю КП(б)Б, бальшавіцкую гісторыю рэвалюцыйнага руху, узьняць адстаючыя участкі нашай работы на культурным фронце ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі сацыялістычнай будоўлі, з агульнымі тэмпамі нашага разьвіцьця. Трэба палепшыць і ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва ўсімі вучасткамі культурнага фронту (літаратура, мастацтва, кіно, радыё, гаспадарка сувязі і г. д.) забясьпечыўшы і ўкараніўшы пралетарскі зьмест на ўсёй гэтай рабоце.

Важнае значэньне набывае далейшая інтэрнацыяналізацыя прадпрыемстваў, далейшае ўмацненьне работы сярод лётэйскіх працоўных мас і польскага насельніцтва.

Вось тыя пытаньні, якія я хацеў ва краснуць у гэтым кірунку.

VIII. Няўхільна пасьпішаць матар'яльна-культурны ўзровень рабочае клясы

Пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва нічыльна зьвязана з ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў партыі і ўраду па далейшым палепшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы.

За апошнія гады мы маем значны рост заработнай платы рабочых. Калі ў 1929 годзе сярэдняя гадавая зарплата аднаго рабочага раўнялася 656 руб., дык у 1931 годзе зарплата рабочага за год дасягне 1.029 руб. У сувязі з шырокім укараненьнем жалочай праны на нашых фабрыках і заводах значна павялічыўся бюджэт рабочай сям'і.

Бюджэт па галіне сацыяльнага страхаваньня ў параўнаньні з мінулым годам павялічыўся на 53,3 проц. Значна ўзрасьлі выдаткі рабочых на культурныя патрэбы. Калі ў 1913 г. выдаткі рабочага на культурныя патрэбы складалі 1 руб. 46 кап., дык у 1931 г. яны дасягнулі 16 руб. 32 кап. Гэтыя лічбы сьведчаць аб культурным росьце рабочага і аб палепшэньні яго матар'яльна-бытавога становішча.

Мы дабіліся некаторых вынікаў у перабудове работы каапэрацыі, у перабудове ўсяго савецкага гандлю і арыхаў у палепшэньні абслугоўваньня рабочага спажыўца і ў першую чаргу рабочых вядучых прафэсій. Для гэтага мы правялі вялікую работу па перабудове ўсёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі, арганізавалі новыя віды каапэрацыі, у прыватнасьці транспартную, лясную, тарфяную, дарабкоўны і г. д. У трэцім і чацьвертым кварталах мінулага году мы адарылі па гарадох 244 магазыны, выкананьне плану на 91,4 проц.

Ёсьць поўныя зрухі і ў справе палепшэньня грамадзкага харчаваньня.

Але гэтыя посьпехі зьяўляюцца яшчэ далёка невыстарчальнымі. Яны яшчэ не адпавядаюць патрабаваньням перыяду сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Пры вызначэньні далейшых задач работы каапэрацыі і палепшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы трэба памятаць указаньні тав. Сталіна, аб тым, што:

«Умовы існаваньня рабочых зьмяніліся ў нас у корані. Рабочы цяпер ня той, што быў раней. Цяперашні рабочы, нават савецкі рабочы хоча жыць з пакрыцьцём усіх сваіх матар'яльных і культурных патрабаваньняў і ў сэнсе харчовага снабжэньня і ў сэнсе жыльлёвага і ў сэнсе забясьпечэньня культурных і іншых запатрабаваньняў. Ён мае на гэта права. І мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы».

Выходзячы з гэтага ўказаньня правадыра нашай партыі, мы павінны прадпрыняць большыя патрабаваньні да ўсёй сыстэмы спажывецкай каапэрацыі, да ўсяго савецкага гандлю. Кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах намеціў цэлы рад задач па палепшэньні работы каапэрацыі і матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы.

Мы ня можам прыняць, што ўсе пасьпяховыя арганізацыі ужо па-баявому перагрупаваліся на выкананьне задач, пастаўленых кастрычніцкім пленумам ЦК. Ёсьць рад фактаў, якія характарызуюць адсутнасьць ініцыятывы, слабасьць работы па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. У гэтым віноваты ня толькі работнікі каапэрацыі, але і пасобныя зьвяньні нашых партыйных арганізацый.

Абсьледаваньне, якое мы пялаўна праводзілі, паказала зусім незадавальняючае становішча на фронце палепшэньня на завозе тавару і невыстарчальнасьць кантролю над завозам тавару у першую чаргу з боку Белкаапсаюзу і Наркамсабу. Каб даказаць гэта, можна прадаць такія факты. У Мазырскі ЦРК завезена 17 вагонаў солі ў той час, як месячная патрэба складае толькі паўтары вагоны. У той-жа ЦРК завезена звыш нормы на 4-ты квартал цукру на 3.000 руб.

Абсьледаваньнем выкрыт цэлы рад фактаў недапушчальнага затавараваньня. Па Сіроцінскім райсаюзе затавараваньне складае суму ў 158,8 тыс. руб. У Бабруйскім ЦРК на складах ляжыць зубнога парашку на 8.000 руб. У адным краме на сыстэме Белгандлю знойдзена на 11.000 руб. папераж. Вельмі часта зусім няправільна разьмяркоўваюцца і накіроўваюцца тавары. Гэта пацьвярджаецца тым, што ў Бабруйскім ЦРК на складах ляжыць солі на 21.000 руб., у той час, як у крамах вясковай каапэрацыі часамі солі ня бывае зусім.

Можна прывесьці безьліч фактаў, якія характарызуюць непаваротлівасьць, нежаданьне працаваць па-новаму работнікаў каапэрацыі. Асабліва вялікае затаварваньне наглядаецца па лініі лясной каапэрацыі. Прыведзеныя факты з усёй выразнасьцю гавораць аб тым, што ў нас вельмі дрэнна выкарыстоўваюцца ўнутраныя рэсурсы і недапушчальна нізкая хуткасьць тавараабароту.

Ня гледзячы на дырэктывы ЦК нашай партыі, гандлёвы апарат да апошняга часу працуе дрэнна, ня мае патрэбнай гібкасьці і адказнасьці за сваю работу. У справе выкарыстаньня фондаў рабочага забясьпечэньня мы часамі сустракаем такое становішча, калі цэнтралізаваныя фонды для забясьпечэньня адпаведных груп рабочых па першым, другім і трэцім сьпісах выкарыстоўваюцца ўнутры сыстэмы тай ці іншай каапэрацыі абязьлічана, не даводзяцца непасрэдна да ўдарнікаў, скарыстоўваюцца на іншыя патрэбы. У сувязі з гэтым вельмі часта ў выкарыстаньні цэнтралізаваных фондаў панує ня толькі абязьлічка, але і самая агідная непадпушчальная ўраўнілаўка.

Я павінен адзначыць, што мы маем рад прыкладаў і фактаў рвацкага падыходу да скарыстаньня цэнтралізаваных фондаў. Напрыклад, на трэці квартал для рабочых па дарожным будаўніцтве было адпушчана 84 тыс. пайкоў. У сувязі з тым, што каапэрацыя да разьмеркаваньня і скарыстаньня пайкоў падыйшла фармальна і бескантрольна перадала гэтыя фонды гаспадарчым арганізацыям, апошнія пайкі выкарысталі за два месяцы. Можна прывесьці другі ня менш абуральны прыклад. Кіраўніцтва Шклабуду, робячы даклад на камісіі выканаўчага, паведамляла, што на будаўніцтве занята ня больш 700 рабочых, а праз 2-3 дні адпаведныя арганізацыі атрымліваюць заяўку на рабочае забясьпечэньне, у якой сьцьвярджаецца, што на будаўніцтве занята 1.500 рабочых.

Палепшаючы сыстэму скарыстаньня нашых фондаў, мы павінны адначасова павесьці рашучую барацьбу з рвацкімі і спажывецкімі настроямі ў адносінах да скарыстаньня фондаў.

Такім чынам наша задача ў галіне перабудовы спажывецкай каапэрацыі і савецкага гандлю павінна перш за ўсё заключацца ў тым, каб, увязваючы работу каапэрацыі і спажываньня з барацьбой за выкананьне прамфінпляну, мы накіроўвалі фонды ў першую чаргу для забясьпечэньня рабочых вядучых прафэсій, у тым, каб ва што-б там ні стала забясьпечыць першы сьпіс.

Ніякай ломкі, ніякай абязьлічкі тут нельга дапускаць. Адначасова мы павінны мабілізаваць усе мясцовыя рэсурсы, каб палепшыць рабочае забясьпечэньне па другім і трэцім сьпісах. Нам патрэбна і надалей займацца перабудовай работы нашай каапэрацыі, перабудовай савецкага гандлю, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на ізаляванае зьяўленьне [illegible] і г. д., проба аўладаць тэхнікай гандлю.

Нам неабходна шырока разгарнуць савецкі гандаль на аснове савецкай палітыкі цэн. Трэба і надалей даваць рашучы адпор як правааппартуністычным, пэйманскім тэндэнцыям у каапэрацыйных і гандлёвых апаратах, так і «леваапартуністычнаму перасэкаваньню праз этап савецкага гандлю да простага прадуктаабмену і разьмеркаваньня.

Задача заключаецца ў тым, каб больш рашуча змагацца з прарыўленьнямі бюракратызму, пэйманскага духу, непаваротлівасьці і нягібкасьці ў рабоце каапэрацыі, каб дабіцца ўдалым якасьці работы ва ўсіх галінах каапэрацыйных абязьлічваньняў.

Мы рашуча павінны змагацца з наплюйскімі адносінамі да спажыўца. У нас і да гэтага часу ў пасобных мясцох захаваліся такія настроі, што спажывец усё зьесьць. Пры тых рэсурсах, якія мы маем, мы можам значна лепш паставіць справу рабочага забясьпечэньня, скарыстоўваючы і мабілізуючы мясцовыя і дадатковыя рэсурсы.

Мы справу павінны паставіць так, каб задача перабудовы каапэрацыі і савецкага гандлю была задачай ня толькі каапэрацыйных арганізацый, а задачай усіх партарганізацый, кожнага вывяна. Можна і трэба крытыкаваць работу каапэрацыі, але трэба і дапамагаць ёй, трэба кантраляваць яе работу і з большай увагай адносіцца да пытаньняў рабочага забясьпечэньня.

Таварышы! Наша партыя паставіла ў парадак дня задачу карэннай перабудовы камунальнай гаспадаркі, падгатаваньня яе да задач, якія стаяць і прад'яўляюцца ўсім ходам сацыялістычнага будаўніцтва і рабочай клясай. У гэтым кірунку, на пастаце пастановы пленуму, ЦК УсеКП(б) распрацаваў рад практычных мерапрыемстваў па перабудове камунальнай гаспадаркі Масквы, Ленінграду, Ніжняга Ноўгараду і. д.

Да гэтага пытаньня КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт яшчэ шчыльна не падыйшлі, каб канкрэтна, на падставе пастановы пленуму ЦК УсеКП(б), прарабіць вялікія мерапрыемствы ў справе рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі. Мы распрацавалі вялікі плян рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі і лічым, што зьезд дасьць дырэктывы ЦК у гэтым кірунку і ў першую чаргу аб перабудове камунальнай гаспадаркі сталіцы БССР—Менску.

У гэтым годзе мы значна павялічваем капітальныя ўкладаньні ў камунальную гаспадарку. У камунальную гаспадарку і жыльлёвае будаўніцтва мы ўкладаем 49 млн. руб. (закрыя кадраў). Зварачаючы асноўную ўвагу на разьвіцьцё камунальнай гаспадаркі ў Менску, мы не павінны забываць і пра перабудову камунальнай гаспадаркі іншых асноўных гарадоў, пралетарскіх цэнтраў БССР (Гомель Віцебск і інш.). Трэба для больш шырокага і пасьпяховага разьвіцьця камунальнай гаспадаркі скарыстаць дадатковыя рэсурсы, якія ў нас ёсьць і якія могуць забясьпечыць нават без асаблівых укладаньняў значнае палепшэньне камунальнай гаспадаркі шляхам палепшэньня санітарных умоў і г. д.

Таму мы павінны да пытаньняў рэканструкцыі і разьвіцьця камунальнай гаспадаркі падыходзіць з большай канкрэтнасьцю, як і да пытаньняў работы каапэрацыі і савецкага гандлю. З гэтага вынікае неабходнасьць выкананьня санітарнага мінімуму, неабходнасьць пастаноўкі лепшай аховы працы на прадпр

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА

Разам з тым з усёй рашучасьцю трэба падкрэсьліць неабходнасьць далейшага, яшчэ больш шырокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі на ўсіх участках нашай работы.

Партыйныя канфэрэнцыі, якія нядаўна скончылі сваю работу, зусім правільна разгарнулі вострую крытыку недахопаў работы і кіраўніцтва з боку нашых цэнтральных устаноў і асабліва ВСНГ і яго аб'яднаньняў, Белкаапсаюзу і яго аб'яднаньняў, Наркамзему, Калгасцэнтру і г. д.

Калі апарат Цэнтральнага Камітэту партыі зрабіў значную перабудову ў кірунку паляпшэньня апэрацыйнага і дыфэрэнцыяванага кіраўніцтва, лепшай пастаноўкі праверкі выкананьня, то ў наркаматах і цэнтральных установах пасьля ліквідацыі округ ня зроблена якіх-небудзь карэнных зьмен у справе кіраўніцтва раёнамі, незавымі зьвеньнямі, у справе спэцыялізацыі і дыфэрэнцыяцыі гэтага кіраўніцтва.

Задачы палітычна-клясавага выхаваньня рабочых і калгасьнікаў

За справаздачны час мы маем вялізарны рост рабочай клясы, яе палітычнай актыўнасьці. Калі на 1-IX 30 г. у прафсаюзах было аб'яднана 189.791 чалавек, дык мы зараз у прафсаюзах маем 332.650 чал. Значна вырасла камсамольская арганізацыя, склад якое да XIV зьезду КП(б)Б раўняецца 176 тыс. чалавек. З часу XIII зьезду КП(б)Б камсамол вырас да 117 тыс. чал. Значна вырасьлі такія арганізацыі, як Асоавіяхім. Моцр, піянэрская арганізацыя, армія рабселькораў і г. д. Гэта паказвае іменна ўзмацненьне арганізаванасьці рабочай клясы.

Але адначасова з гэтым я павінен падкрэсьліць, што гэтымі лічбамі росту арганізаванасьці рабочай клясы мы не павінны захапляцца. Мы не павінны забываць самага галоўнага, што ў сувязі з ростам рабочай клясы ў рады пралетарыяту ўліваюцца новыя кадры, у тым ліку і дробна-буржуазныя элемэнты горада і вёскі, якія з сабой прыносяць далёка не пралетарскую ідэалёгію ў асяродзішча рабочай клясы.

І таму в усёй вострасьцю перад намі паўстае задача палітычна-клясавага выхаваньня рабочай клясы і калгасьнікаў. Новыя абставіны, новыя запатрабаваньні ў сувязі з сацыяльна-эканамічнымі зрухамі, якія адбыліся ў нашай краіне, патрабуюць яшчэ большага асваеньня рабочай клясай задач, якія стаяць перад ёю ў заключным годзе першай пяцігодкі і ў другой пяцігодцы, якую мы зараз распрацоўваем. Гэта патрабуе ўзьняцьця палітычнага і культурнага ўзроўню рабочай клясы.

Для таго, каб дасягнуць яшчэ больш актыўнага ўдзелу рабочай клясы ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, каб узьняць на большую вышыню справу сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыю гаспадарча-разрахунковых брыгад, мы павінны перад сабою паставіць задачу больш шпаркага і мыбоўкага палітычнага выхаваньня рабочых, задачу перабудовы ўсёй масавай работы, прапаганды і агітацыі.

Мы павінны дыфэрэнцыяваць усю нашу работу з тым, каб, апіраючыся на перадавыя кадры рабочай клясы, падцягнуць адсталых, якія не канчылі яшчэ са сваімі дробна-буржуазнымі настроямі, і забясьпечыць пасьлядоўную барацьбу з ухіламі дробна-буржуазнымі празьліленьнямі і плынямі ся род новых рабочых.

Вядняцка-серадняцкія масы вёскі рашуча сталі на шлях стварэньня буйной сацыялістычнай гаспадаркі. Тое, што беднякі і серадняки ўвайшлі ў калгасы, зусім ня значыць, што ў нас на вёсцы ўсё добра, што няма за што змагацца.

Задача заключаецца ў тым, каб у калгасах узьняць на большую вышыню прадукцыйнасьць працы, а гэта вельмі шчыльна зьвязана з разгортваньнем палітычна-выхаваўчай работы. Для ўчарашняга бедняка і серадняка — аднаасобніка часамі дзіўнай і незразумелай зьяўляецца зьдзеўшчына. Традыцыі дробнага гаспадара-ўласьніка вікамі ўбіваліся ў галовы бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Таму задача палітычнага выхаваньня шырокіх мас калгасьнікаў зьяўляецца надзвычай актуальнай.

Я павінен падкрэсьліць, што за апошні час мы маем простую недацэнку ў радзе выпадкаў работы сярод жанчын. Разгортваючы работу і ўцягваючы ў яе ўсе атрады пралетарскай грамадзкасьці, мабілізуючы гэту грамадзкасьць на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, нам трэба падцягнуць адсталую частку жанчын, якія адыгрываюць вялікую ролю і актыўнасьць якіх з кожным днём расьце.

IX. Пытаньні ўнутрыпартыйнай работы

— Пераходжу да апошняга разьдзелу свайго дакладу аб унутрыпартыйнай рабоце. Усе тыя дасягненьні, аб якіх я гаварыў, сталі магчымымі, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву з боку нашай КП(б)Б і яе ЦК усімі працэсамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Неабходна паставіць пытаньне, ці ўсё зроблена КП(б)Б для таго, каб з посьпехам будаваць сацыялізм і ліквідаваць сапраўдну эканамічнай і культурнай адсталасьці БССР? Ці правільна кіраваў ЦК КП(б)Б сацыялістычным будаўніцтвам за мінулы пэрыяд? Што патрэбна для таго, каб правільна кіраваць у нашых сучасных умовах?

— На гэта пытаньне тав. Сталін у сваёй справаздачы на XVI зьезьдзе УсеКП(б) даў такі адказ: «Для правільнага кіраўніцтва партыяй неабходна, апрача ўсяго іншага, каб лінія партыі была правільнай, каб масы зразумелі правільнасьць партыйнай лініі і падтрымлівалі яе актыўна, каб партыя не абмяжоўвалася выпрацоўкай генэральнай лініі, а кіравала са дня ў дзень правядзеньнем яе ў жыцьцё, каб партыя вяла рашучую барацьбу з ухіламі ад генэральнай лініі і з прымірэнцтвам, каб у барацьбе з ухіламі партыя карала адзінства сваіх радоў—жалезную дысцыпліну».

Гэтай устаноўкай правадыра партыі кіраваўся ў сваёй штодзённай рабоце наша КП(б)Б і яе ЦК. Аб правільнасьці нашай лініі сьведчаць тыя вялізарныя посьпехі, якіх мы дасягнулі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Мы рашуча змагаліся з ухіламі ад лініі партыі, даючы бязьлітасны адпор усім скажэньням як справа, так і «зьлева», і прымірэнцтву да апартуніізму. Барацьба за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі адбываецца побач з магутным узьлётам творчай і палітычнай актыўнасьці рабочай клясы і калгасных мас, што выяўляецца ў шырокім разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва і яго вышэйшых форм—гаспадарча-разрахунковых брыгад і г. д. Аўтарытэт партыі сярод рабочых і калгасных мас значна ўзрос, масы яшчэ шчыльней згуртаваліся вакол сваёй партыі. Аб гэтым, апрача ўсяго іншага, сьведчыць тое, што за апошні час мы маем вялікі прыліў у шэрагі партыі, вялікі рост КП(б)Б за лік перадавых, найбольш актыўных рабочых і калгасьнікаў.

Кіруючыся ўстаноўкамі XVI зьезду партыі, мы рашуча перамагалі апартуністычнае супраціўленьне ў сэнсе перабудовы ўсёй нашай работы, праводзілі энэргічна работу па мабілізацыі мас на актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, рашуча змагаліся за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў прамысловасьці, транспарце, каапэрацыі і г. д. ЦК КП(б)Б, праводзячы абсьледваньне розных галін работы, своечасова рэагаваў на факты скажэньня лініі партыі. Выяўлен рад фактаў апартуністычнага супраціўленьня правядзеньню пасеўных плянаў, было зьнята праваапартуністычнае кіраўніцтва Ўраварыцкага і Старадарожскага раёнаў, таксама зьнята кіраўніцтва Клічэўскага, Асіпавіцкага раёнаў і кіраўніцтва Белсельтрэсту за апартуністычнае патураньне спажывецка-кулацкім, буржуазным тэндэнцыям, якія праяўляліся ў радзе калгасаў і саўгасаў у сувязі з правядзеньнем абожжазагатоўчай кампаніі.

ЦК КП(б)Б рашуча змагаўся супроць апартуністычнага скажэньня лініі партыі ў калгасным будаўніцтве. Выкрыт рад фактаў ігнараваньня цэнтральнай задачы калгаснага руху—арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, фактаў пагоні за дутымі процантамі калектывізацыі, што мела асаблівае пашырэньне ў Койданаўскім, Капыльскім, Лепельскім, Бягомльскім і Асіпавіцкім раёнах. У Чачэрскім, Лельчыцкім і Чырвонаслабодзкім раёнах практыкавалася шырокае адміністраваньне ў адносінах да серадняка, даваліся цьвёрдыя заданьні серадняцкім гаспадаркам з мэтаю ўцягненьня ў калгасы. ЦК КП(б)В рашуча рэагаваў на ўсе гэтыя факты «левацкага» перагібу і праваапартуністычнай практыкі, якія грэлі на руку толькі клясаваму ворагу.

Змагаючыся за выразнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, КП(б)В і яе ЦК вялі бязьлітасную барацьбу з розныя ўхілам у нацыянальнай. КП(б)В разгромілі нацыянал-дэмакратаў і іх агентуру — нацыянал-апартуністаў у радах нашай партыі. Мы выкрылі і рашуча рэагавалі на праяўленьні ўхілу да вялікадзяржаўнага шавінізму. Паданьня вышэй фэкты канкрэтнай барацьбы сьведчаць аб рашучасьці і непрымірымасьці КП(б)В у барацьбе супроць апартуністаў і ўхілаў ад ленінскай лініі ў надпытаньні.

КП(б)В і яе ЦК у сваім змаганьні за пабудову сацыялізму высока трымаюць сьцяг Леніна. Пад гэтым сьцягам, на аснове нахільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, мы дабіліся вялізарнейшых перамог на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Перад КП(б)В стаіць адна з важнейшых задач перабудовы работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым напрамку дасягнута ўжо многае. Якасьць работы партячэек у сэнсе канкрэтнасьці і апэрацыйнасьці значна палепшылася. За справаздачны пэрыяд з XIII да XIV зьезду КП(б)В вырасла на дзесяткі тысяч за лік лепшай часткі рабочых і перадавых, праверэных у клясавых баёх, калгасьнікаў. Калі на 1 ліпеня 1930 году налічвалася ў складзе КП(б)В 41.347 чалавек, дык на 1 кастрычніка 1931 году мы маем 54.392 чалавекі, а на 1 студзеня 1932 году—больш 56.000 чал. (без вайсковых).

У росьце КП(б)В мы маем вялізарныя дасягненьні. Але адначасова мы павінны адзначыць недахопы, якія заключаюцца ў недавыкананьні задачы адносна павялічэньня праслойкі рабочых з вытворчасьці ў складзе нашай арганізацыі. Удзельная вага ў складзе КП(б)В рабочых ад варштату з часу XIII зьезду панізілася прыблізна на 4-5 проц. Прычына гэтага зьніжэньня заключаецца ў невыстарчальным разгортваньні партарганізацыямі сыстэматычнай работы па вярбоўцы ў партыю перадавой часткі рабочых у адпаведнасьці в ростам іх актыўнасьці.

Устаноўлены процант прыёму рабочых асноўнымі арганізацыямі ня выконваецца. Так, напрыклад, менская, віцебская і гомельская партарганізацыі, якія зьяўляюцца арганізацыямі буйнейшых прамысловых центраў, не забясьпечылі устаноўленых дырэктывамі ЦК 95 проц рабочых з вытворчасьці ў складзе ўсяго прыёму. За першыя тры кварталы 1931 году гэтыя арганізацыі ў сваім прыёме мелі толькі 81 проц. рабочых з вытворчасьці. У сувязі з гэтым мы маем пры абсалютнай колькасьці росту рабочай клясы ўсё-ж некаторае зьніжэньне колькасьці рабочых з вытворчасьці ў складзе КП(б)В. Яшчэ ня зусім выстарчальная партыйная праслойка на прадпрыемствах і транспарце. Па 20 буйнейшых прадпрыемствах партыйная праслойка зьнізілася з 19,4 проц. да 16,3 проц.

Значны рост і паляпшэньне якасьці работы дасягнуты ў вясковых партарганізацыях, у рабоце саўгасных і калгасных ячэек. Павялічыўся рост партарганізацыі і за лік жанчын. У 1931 годзе прынята ў КП(б)В жанчын на 17,5 проц. больш, чым за тры кварталы 1930 году. У адносінах росту партыі за лік камсамольцаў мы маем такі малюнак: у 1929 годзе камсамольцы ў прыёме складалі 35,1 проц., у 1930 годзе—25 проц., і за тры кварталы 1931 году—24,2 проц. Пытаньню росту партыі за лік камсамолу трэба надаць больш увагі і асабліва шырока разгарнуць марксыцка-ленінскае выхаваньне.

Якасны склад кіруючых парторганаў і іх работа значна палепшыліся. Гэта паляпшэньне ідзе за лік павялічэньня ў складзе кіруючых парторганаў — бюро ячэек, гарадзкіх і раённых камітэтаў — рабочых. Абнаўленьне кіруючых органаў нізавых і сярэдніх партыйнасьцяў у 1929 годзе была на 45 проц., увосені 1930 году — 65,2 проц. Зараз, паводле пазрэдніх вынікаў перавыбарчай кампаніі, мы маем таксама паляпшэньне і абнаўленьне кіруючага складу нашых партыйных арганізацый.

Паляпшэньне якасьці работы нашых вытворчых парт'ячэек заключаецца, галоўным чынам, у перакананьні центру пляжару работы ў нізавыя зьвеньні — цэх, зьмену, брыгаду. Значныя дасягненьні набыты ў справе ўмацаваньня вясковых парт'ячэек і перабудовы іх работы ў адпаведнасьці з пастановамі XVI зьезду партыі. Створаньнем сельпарткомаў—апорных пунктаў пры парт'ячэйках МТС, буйнейшых ячэек саўгасаў забясьпечана павялічэньне ўплыву і паляпшэньне парткіраўніцтва работай у вёсцы, работай па сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Паводле ўліку, на 1 кастрычніка 1931 году ў нас налічваецца ў вёсцы 100 сельпарткомаў, якія яднаюць 400 ячэек, або 30 проц. усяго складу вясковых парт'ячэек.

Мы правялі значную перабудову работы апарату ЦК у напрамку арганізацыі тэрытарыяльных сэктароў, спэцыялізаваных сэктароў, увядзеньня непасрэднага інструктарскага апарату па спэцыяльных галінах работы. Гэтай перабудовай забясьпечваецца дыфэрэнцыяванае кіраўніцтва, сыстэматычная дапамога раённым партарганізацыям.

Характарыстыка посьпехаў у галіне перабудовы партыйнай работы на вытворчасьці і ў вёсцы не выключае сабою наяўнасьці раду адмоўных зьяўленьняў у гэтым напрамку. Там, дзе дасягнута перабудова партработы ў адпаведнасьці з дырэктывамі партыі, значна павышана авангардная роля камуністаў, там з посьпехам выконваюцца вытворчыя заданьні. І, наадварот, дзе да задач перабудовы работы падыйшлі фармальна, павярхоўна, іменна там мы маем найбольшае адставаньне ў выкананьні пастаўленых задач.

Адсюль вывад — мы павінны змагацца за поўную перабудову нашай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, узьнімаць на вышэйшую ступень кіруючую ролю нізавых партзьвеньняў, павышаць кіруючую ролю камуністаў на прадпрыемстве, у калгасе, саўгасе, на ўсіх участках нашай работы. Гэтага можна дабіцца пры ўмовах змаганьня з усякімі праяўленьнямі фармальнага падыходу да перабудовы партыйнай работы.

Асаблівую ўвагу мы павінны і будзем аддаваць справе далейшага ўмацаваньня вясковай партыйнай арганізацыі, далейшага павышэньня палітычнага ўзроўню вясковага камуніста і кіруючых партыйных кадраў у вёсцы. Наогул, справа марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас і, галоўным чынам, новага папаўненьня, павінна займаць адно з важнейшых месц у сыстэме штодзённай работы ўсіх зьвеньняў партыйнай арганізацыі.

Справу далейшага росту партыйнай арганізацыі за лік перадавых рабочых, лепшых ударнікаў сацыялістычнага спаборніцтва, за лік рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, якія прайшлі школу сапраўднай барацьбы з кулаком за сацыялістычную рэконструкцыю сельскай гаспадаркі, якія актыўна змагаюцца за арганізацыі на-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў,—мы павінны падпарадкаваць задачам паляпшэньня якасьці работы, задачам павышэньня тэмпаў і якасных паказальнікаў работы на кожным прадпрыемстве, саўгасе, калгасе.

У нашай арганізацыі значнае месца займае і вельмі вялікую ролю адыгрывае вайсковая партарганізацыя. Вайсковая партарганізацыя побач са сваёй асноўнай работай на баярой і палітычнай падрыхтоўцы прымае актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В, і сваіх непасрэдных кіруючых партыйных органаў вайсковая партарганізацыя Акругі з посьпехам спраўляецца з пастаўленымі перад ёю задачамі. Яна зьяўляецца маналіцным, бальшавіцкі згуртаваным атрадам у барацьбе за генэральную лінію партыі.

— Я, таварышы, хачу ў двох словах спыніцца на рабоце нашага камсамолу. Камсамол значна вырас і зьяўляецца актыўным удзельнікам і памочнікам партыі ў сацыялістычным будаўніцтве. Мы маем нямат прыкладаў, актыўнага ўдзелу паасобных арганізацый камсамолу, камсамольцаў у выкананьні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, я павінен адзначыць, што мы назіраем у апошні час нямат прарываў і недахопаў у рабоце камсамолу ў сэнсе яго ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.

ЦК УсеЛКСМ зараз праводзіць абсьледваньне камсамольскай арганізацыі Беларусі. Я думаю, што нам, партыйнай арганізацыі,—прыдасьцца больш заняцца пытаньнямі, зьвязанымі з задачамі павышэньня тэмпаў работы камсамольскай арганізацыі і ўдзелу апошняй ў сацыялістычным будаўніцтве. Нам неабходна заняцца радам агульных і практычных пытаньняў, зьвязаных з пастаноўкай работы за лепшае марксыцка-ленінскае выхаваньне камсамолу і за падрыхтоўку камсамольскіх кадраў.

Трэба сказаць, што ў значнай меры віну за прарывы ў рабоце камсамолу павінны ўзяць на сябе мясцовыя партарганізацыі. За апошні час партыйнае кіраўніцтва ў сэнсе непасрэднай практычнай дапамогі, непасрэднага прыцягненьня паасобных зьвеньняў камсамолу да больш актыўнага ўдзелу ў рабоце некалькі аслабілася. Толькі некаторыя нашы арганізацыі, як менская, гомельская і інш. больш станялі пытаньне аб рабоце камсамолу, абмеркавалі гэта пытаньне на пленумах гаркомаў і г. д. Ад партыйных арганізацый патрабуецца ўзмацненьне кіраўніцтва работай камсамолу, выкарыстаньне тых фэштак і адрыжак прушэўчыны, якія ёсьць яшчэ ў радзе кіруючых кадраў камсамолу. Гэтыя факты ненармальнага становішча ў некаторых частцы кіруючага актыву камсамолу дэмабілізуюць, а не згуртоўваюць камсамол для належнай барацьбы за выкананьне пастаўленых перад ім задач.

За мінулы адрэзак часу партыя дасягнула буйных посьпехаў у галіне друку. У сэнсе кіраўніцтва і павышэньня ролі друку, як памочніка партыі, гэтай найвастрэйшай зброі ў барацьбе за генэральную лінію і выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній. Зараз налічваецца ў нас 13 центральных газэт; з іх 1—на беларускай мове, адна на польскай, 3 — на яўрэйскай, 2 — на расійскай і 1 — на літоўскай: 7 центральных раённых газэт і мы маем 61 гарадзкую і раённую газэту з агульным тыражом у 306.000 экзэмпляраў. Таксама мы маем вялікі рост ліквідора друку. Аб гэтых дасягненьнях ЦК КП(б)В адзначыў у сваіх пастановах, аб гэтым гаварылася і ў адпаведных артыкулах «Праўды».

Дасягненьні нашага друку характарызуюцца значнымі посьпехамі ў справе перабудовы яго работы ў адпаведнасьці з новымі запатрабаваньнямі, узмацненьнем барацьбы за бальшавіцкую партыйнасьць кожнага зьвяна друку, посьпехамі перабудовы работы рабселькораўскага руху, спэцыялізацыяй друку ў адпаведнасьці са спэцыялізацыяй раёнаў. Наш друк паказаў прыклады бальшавіцкай барацьбы за разгортваньне самакрытыкі.

Аднак, ня гледзячы на гэтыя посьпехі, мы маем выпадкі няправільнага падыходу з боку нашага раённага друку да разгараньня на тое ці іншае пытаньне, што патрабуе большага кіраўніцтва партарганізацый работай друку. Мы мелі зусім недапушчальнае процістаўленьне газэты партыйнаму кіраўніцтву (Барысаў), спробы газэты стаць над партыйным кіраўніцтвам. Мы мелі некаторыя факты пагоні за сэнсацыяй замест разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі.

Мы выкрылі рад грубых палітычных памылак, якія бліскучаны пасобнымі газэтамі («Беларуская вёска», «Чырвоная зьмена і г. д.).

Павышаючы і ў далейшым нашу бальшавіцкую самакрытыку, не зважаючы ні асобы, шырэй разгортваючы самакрытыку ў нашым друку, мы павінны дамагацца паляпшэньня партыйнага кіраўніцтва друкам у тым сэнсе, каб гэта самакрытыка была дзелавой, канкрэтнай, мабілізуючай і дапамагаючай выкананьню мас, каб аднаасобна гэта самакрытыка была палкам падпярадкавана пасьпяховаму выкананьню чарговых задач партыі.

Задача нашага друку ў далейшым павінна заключацца ў тым, каб друк, зьяўляючыся моцнай зброяй партыі, узьняў на яшчэ больш высокую ступень канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць сваёй работы, каб яшчэ больш узьняў сваю арганізатарскую ролю ў справе мабілізацыі мас на барацьбу за ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва. Неабходна дабіцца далейшага паляпшэньня сеткі газэт у саўгасах і калгасах, што значна спрыяе паляпшэньню тым работы. Ад нашага друку патрабуецца ўзмацненьне барацьбы за канкрэтныя асноўныя задачы партыі, за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, вылучэньне ў сваёй рабоце галоўных зьвеньняў, канцэнтрацыя і мабілізацыя ўвагі партарганізацый на вузлавых задачах.

Гэты год зьяўляецца годам значнага павароту нашых партарганізацый да пытаньняў марксыцка-ленінскага выхаваньня. У сувязі з тымі мерапрыемствамі, якія правяла КП(б)В і яе Цэнтральны Камітэт, мы маем у гэтым напрамку значны зрух. Аднак, пастаўленая намі задача стопроцантнага ахопу вучобай новых членаў і кандыдатаў партыі яшчэ ня выканана. Невыкананьне гэтай дырэктывы тлумачыцца недацэнкай паасобнымі арганізацыямі значэньня і важнасьці марксыцка-ленінскага выхаваньня. Мы выкрылі цэлы рад фактаў недацэнкі гэтай справы (Бабруйская, Чачэрская, Лоеўская арганізацыі). Асабліва слабым месцам зьяўляецца пастаноўка выхаваўчай работы з кандыдатамі. Па менскай арганізацыі ахоплена партвучобай толькі 25 проц. кандыдатаў, па віцебскай — 24 проц., па гомельскай — 38 проц., па перахаўскай — 31 проц., прапойскай — 32 проц. Наша задача заключаецца ў тым, каб, ліквідуючы недацэнку партыйнай вучобы, дабіцца максымальнага паляпшэньня справы марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас, што зьяўляецца важнейшай, неабходнейшай умовай далейшага пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва, далейшай барацьбы супроць апартуністаў, трацкісцкай кантрабанды і гнілога лібералізму.

На новым этапе сацыялістычнага будаўніцтва мы маем праяўленьні апартунізму ў новых формах. Перад тварам вялікіх перамог генэральнай лініі партыі ворагі рабочай клясы і іх агентура ў радох нашай партыі ўжываць усё больш скрытыя, замаскаваныя формы сваёй барацьбы супроць партыі, супроць яе генэральнай лініі.

— Тав. Кагановіч у сваёй прамове, прысьвечанай дзесяцігодзьдзю інстытуту Чырвонай Прафэсуры, наконт гэтага гаварыў:

«Адкрыта пад сьцягам трацкізму выступаць зараз цяжка, мас не завоюеш, капіталу не нажывеш. Трэба выступаць пад іншымі сьцягамі, тэзісамі, фармулёўкамі...»

Ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революцыя» які (ліст) зьяўляецца дакумантам вялікай палітычнай важнасьці, паставіў з усёй вострасьцю пытаньне аб павышэньні партыйнай пільнасьці, аб павышэньні марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас, аб сапраўдным ленінскім разуменьні гісторыі партыі.

Абагаўраючы ліст тав. Сталіна, нашы партыйныя арганізацыі і ў першую чаргу перадавыя атрады КП(б)В—менская, гомельская, віцебская арганізацыі—яшчэ больш павысілі сваю бальшавіцкую пільнасьць. Разам з тым выкрыт рад слабых месц на нашым тэарытычным фронце, рад слабых месц у пастаноўцы справы марксыцка-ленінскага выхаваньня. Мы сустрэліся з фактамі ідэалізацыі люксэмбурчыянства, выправільнага асьвятленьня Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі, скажэньня гісторыі партыі бальшавікоў у тэарытычных творах Агурскага, Поташа, Майзэля, Шачавалава, Шчарбакова і іншых. Мы сутыкнуліся з такім фактам, што тэарытычны ўзровень нашых кадраў, якасьць часткі нашых кадраў на тэарытычным фронце нас ня можа задаволіць.

У сувязі з абагаваньнем ліста тав. Сталіна мы выкрылі ў нашай партарганізацыі трацкістаў - кантрабандыстаў у асобе Югава, які меў магчымасьць з прычыны гнілога лібералізму сярод часткі камуністаў доўгі час праяжджаць у нашу літаратуру яўна трацкісцкую кантрабанду, артыкулы яўна трацкісцкага зьместу. У радзе адказьнейшых нашых часопісяў, у тым ліку і ў «Бальшавіку Беларусі», зьмясьціліся артыкулы ў трацкісцкай трактоўцы, у трактоўцы ролі КП(б)Б у перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі не як арганізатара рабочай клясы для барацьбы за пралетарскую рэвалюцыю, а як асоб, якія літаліся, знаходзіліся пад уплывам дробна-буржуазнай стыхіі і г. д. Гэтыя творы трацкісцкага кантрабандыста Югава зараз выкрыты і ён выключан з радоў КП(б)В. Але гэты факт паказвае, што на тэарытычным фронце рад адказных таварышоў, якія мелі сувязь і непасраднае дачыненьне да работ Югава, правялі гнілы лібералізм у адносінах да трацкісцкай кантрабанды.

Пры абмеркаваньні ліста тав. Сталіна ў нашай партарганізацыі мы сустрэліся з фактамі, калі некаторыя таварышы імкнуліся ў аднолькавай меры абвінавачваць побач з яўнымі трацкісцкімі кантрабандыстамі і тых таварышоў, якія дапусьцілі памылку, але здольны і жадаюць яе выправіць. Такі падыход недапушчальны. Трэба рашуча выкрываць і выганяць з радоў нашай партыі яўных трацкісцкіх кантрабандыстаў, але ўмець адрозьніваць кантрабандыста ад таварыша, які стаіць на генэральнай лініі партыі, змагаецца за яе ажыцьцяўленьне, але дапусьціў у тэй ці іншай рабоце памылку. Такім таварышом трэба дапамагчы, як мага хутчэй выправіць гэту памылку, а не «прапрацоўваць» яго без канца, ня біць яго з наскоку.

Ліст тав. Сталіна, як гэта падкрэсьліў тав. Постышаў у сваім выступленьні, стаіць перад партарганізацыяй задачу марксыцка-ленінскага выхаваньня. Іменна глыбокае вывучэньне ленінізму, гісторыі нашай партыі павінна быць пакладзена ў аснову ўсяго марксыцка-ленінскага выхаваньня партыйных мас, у аснову работы па падрыхтоўцы кадраў.

Вось малюнак барацьбы, перамог і задач, з якімі прыйшла КП(б)В да свайго XIV зьезду. КП(б)В падыйшла да XIV зьезду і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі з гіганцкімі перамогамі, бальшавіцкі згуртаванымі радамі вакол ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)В і правадыра партыі тав. Сталіна.

КП(б)В і ў далейшым будзе з усёй бальшавіцкай рашучасьцю змагацца за генэральную лінію партыі супроць правага ўхілу—галоўнай небясьпекі, супроць «левых» загібаў, супроць прымірэнцтва да іх, супроць гнілога лібералізму, высока трымаючы сьцяг ленінізму і далей будзе верным мабілізатным атрадам УсеКП(б).

Пад сьцягам Леніна мы дабіліся рашаючых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, пад сьцягам Леніна мы будзем змагацца за далейшыя перамогі сацыялізму.

Няхай жыве УсеКП(б)!

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б), на чале з правадыром нашай партыі тав. Сталіным! (Гучныя воплескі).

Спрэчкі па справаздачы ЦК КП(б)Б

Прамова тав. Рачыцкага

Таварышы, я лічу неабходным спыніцца на двох асноўных пытаньнях, якія маюць выключнае значэньне ў разьвіцьці с.-г. вытворчасьці. Першае пытаньне—гэта павышэньне вытворчасьці і прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі і другое пытаньне — барацьба са стратамі, якія мы маем у галіне сельскай гаспадаркі.

На сёньняшні дзень мы маем яшчэ невыстарчальную прадукцыйнасьць у сельскай гаспадарцы, нізкі ўраджай, нізкі ўдой і г. д.

Дзе прычыны? Чаму ўраджай на палёх саўгасаў у сярэднім ня больш 8-10 цэнтн. па збожжавых культурах і па тэхнічных—2-2½ цнт. з гэктару? Дзе прычыны таго, што мы з гэктару атрымліваем 90-100 цэнтн. бульбы? Чаму ўдой каровы 1.000-1.2000 літраў, а сярэдняя вага зданых дзяржаве сьвіней — 45 кгр? Я лічу, што такое становішча перш за ўсё тлумачыцца тым, што мы не навучыліся палбіраць людзей, не навучыліся іх расстаўляць, патрабаваць ад іх адказнасьці за даручаную справу, не навучыліся весьці адпаведны ўлік і займацца «дробязямі». Мы не займаемся такімі «дробязямі», праз вырашэньне якіх можна было-б лепш арганізаваць работу, павысіць прадукцыйнасьць працы, узьняць вытворчасьць і тавэрнасьць сельскай гаспадаркі.

Бяда ў тым, што мы пытаньнямі павышэньня ўраджайнасьці не займаемся сыстэматычна, штодзенна, канкрэтна. У гэтым напрамку ёсьць часта больш агульных разважаньняў, чым канкрэтнай справы. У радзе выпадкаў няма канкрэтнага кіраўніцтва, неабходнай расстаноўкі сіл. На мясцох не займаюцца такімі простымі пытаньнямі, як вапнаваньне і торфаваньне глебы. Не скарыстоўваюцца іншыя ўнутраныя рэсурсы, не падбіраецца, ня чысьціцца насеньне, ня сочаць, дзе, што і калі сеяць. І ўсё гэта, парэшце, адбіваецца як на ўраджайнасьці, так і на прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі.

Прасьцейшае мерапрыемства—ачыстка насеньня на тэй плошчы, якую мы запраектавалі ў 1932 г., дасьць нам дадатковы прырост збожжа ў ліку 642.000 цэнтн. і паўтара мільёна цэнтнэраў бульбы.

Дастасаваньне такога мерапрыемства, як тарфаваньне, якое, да рэчы, па якасьці ніколькі ня ніжэй за саломенае ўгнаеньне, павышае ўраджай з гэктару да 20 проц., а калі торф прапусьціць праз компасныя кучы ўраджаю павышаецца да 50 проц., паводле нагляданьняў усесаюзнага тарфянога інстытуту). Ужываньне гэтага ўгнаеньня пад пасевы тэхнічных культур дае яшчэ лепшыя вынікі. Тут можна прывесьці такі прыклад. У Сіроцінскім раёне два сумежныя калгасы, якія маюць аднолькавую глебу ў мінулым годзе, далёка няроўны атрымалі ўраджай. У адным калгасе ўраджай ільну ледзь дасягае 1,4 цнт., у другім ён перавышае 3 цнт.

Гэта, бясспрэчна, тлумачыцца ўжываньнем угнаеньня, ачысткай насеньня, ажыцьцяўленьнем прасьцейшых агранамічных мерапрыемстваў. Там, дзе ўжываюцца агранамічныя мерапрыемствы, значна вышэй ураджайнасьць, вышэй тавэрнасьць сельскай гаспадаркі.

Мы ўжо тры гады змагаемся за вапнаваньне глебы. Але і зараз яшчэ вельмі часты выпадкі, калі вапна не пападае на поле калгасаў і саўгасаў. У лепшым выпадку вапну прывозяць у гаспадарку, у горшым—яе скідаюць па дарозе ў казаву. У мінулым годзе 13 проц. мінэральнага ўгнаеньня засталося ў БССР нескарыстаным. Гэта ўгнаеньне і да сёньняшняга дня ляжыць па чыгуначных станцыях.

Тут рагачоўцы скарэліліся, што да іх мінэральнага ўгнаеньня завезьлі ў запас на тры гады. Гэта няправільна. Такія разважаньні паказваюць, як мы адносімся да выкананьня пастаноў партыі і ўраду аб узьняцьці ўраджайнасьці, аб павышэньні тавэрнасьці сельскай гаспадаркі. Саюзныя органы нам даюць толькі пятую частку мінэральнага ўгнаеньня да тэй колькасьці, якога нам патрэбна. Як-жа можна завезьці ўгнаеньня на тры гады ўперад?

У 1931 годзе нашы трактарны парк меў 25-27 проц. прастою. Гэта таму, што мы ня сочым за «дробязямі», імі не займаемся, а яны складаюць сабою цэлыя праблемы.

Работа па вапнаваньні і тарфаваньні глебы, па зборы попелу, падбор насеньня, ачыстка яго—гэта баявая работа ня толькі зямельна - калгасных органаў, а і партыйных арганізацый, саветаў, камсамолу і г. д. У галіне барацьбы за ўраджай партыяй пастаўлены зусім выразныя задачы. Трэба спыніць голыя разважаньні аб ўраджайнасьці, а заняцца канкрэтным кіраўніцтвам, канкрэтнай работай у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці на палёх нашых саўгасаў і калгасаў.

1932 год павінен быць годам пераводу ўсіх калгасаў і саўгасаў на шматпольны, правільны севазварот. Тэрміны сяўбы ва што-б там ні стала трэба скараціць. У нас збожжавыя культуры вясной сеюцца на працягу двох месяцаў у той час, як сяўба павінна быць закончана за 10-15 дзён. Пазьні пасеў цягне за сабой позьнюю ўборку і паніжае ўраджайнасьць. Аб гэтым нельга забываць.

Кожны год мы нясем вялікія страты па ялавасьці стада, у выніку чаго недаатрымліваем сотні тысяч

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

XVII УСЕСАЮЗНУЮ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ АДЗНАЧЫЦЬ ЗАВЯРШЭНЬНЕМ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

28 студзеня

Ход збожжазагатовак па БССР усё яшчэ застаецца зусім **нездавальняючым.** Паводле даных Наркамснабу на 25 студзеня гадавы плян збожжазагатовак выкапан усяго **на 85,5 проц.** Тэмпы загатовак за апошнюю пяцідзеўку ня толькі не павялічыліся, але, наадварот, **зьнізіліся.** Калі з 15 да 20 студзеня прырост складаў 3,4 проц. гадавога плану, дык за пяцідзеўку з 20 да 25 студзеня — прырост толькі 1,2 проц.

Гэтыя лічбы выразна сьведчаць аб тым, што адстаючыя раёны ўсё яшчэ не пераключылі збожжазагатоўкі на сапраўды баявыя рэйкі, не мабілізавалі масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сераднякоў на максымальнае фарсаваньне загатовак, на поўнае выкананьне і перавыкананьне плянаў за скарачэньня работ XIV зьезду КП(б)Б.

У ганебным тыле збожжазагатовак усё яшчэ застаюцца Старадарожскі, Ігранскі, Клічаўскі, Камарынскі, Жлобінскі, Брагінскі, Пятрыкоўскі, Чавускі, Койданаўскі, Мазырскі, Хойніцкі, Чачэрскі, Чэрвеньскі, Чырвонапольскі і інш. раёны.

Сацыялістычны сэктар у цэлым па рэспубліцы перавыканаў плян збожжазагатовак: калгасы — на 103,7 проц., саўгасы — на 101,2 проц. Аднак, больш рад саўгасаў і калгасаў, якія дагэтуль яшчэ не завяршылі збожжаздачы. Паасобныя калгасы і саўгасы ня выканалі нават і паловы гадавога заданьня. Адсюль баявая задача як саўгаснай, так і калгаснай сыстэмы — дабіцца рашучага ўзмацненьня здачы збожжа ва ўсіх адстаючых калгасах і саўгасах, павесьці барацьбу за высокаўваньне сустрэчных плянаў і поўнае выкананьне іх у дні работы XIV зьезду КП(б)Б.

Самыя адсталым вучасткам, куды трэба накіраваць максымум увагі і энэргіі, зьяўляецца **аднаасобны** сэктар. На 25 студзеня плян загатовак збожжа па гэтым сэктары выканан толькі на **75,1 проц.** Гэта вынік агарэтуністычнай недацэнкі ў радзе раёна і сельсаветаў ролі аднаасобніка ў збожжазагатоўках (Шклоў, Рагачоў, Парычы і інш.). З гэтым агідным скажэньнем палітыкі партыі ў загатоўках трэба пакончыць. Аднаасобны сэктар займае вялікае месца ў агульным пляне збожжазагатовак, і задача ўсіх партарганізацый — ва што-б тым ні стала дабіцца поўнага выкананьня пляну па гэтым сэктары.

Зусім дрэнна стаіць справа са спагнаньнем **цьвёрдых заданьняў** з кулацка-заможных гаспадарак. На 25 студзеня цьвёрдыя заданьні ў сярэднім па рэспубліцы спагнаны толькі на 47,8 проц.; прырост ня апошнюю пяцідзеўку складае ўсяго... 0,4 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб паўпасьці махровай праваапартуністычнай практыкі ў паасобных раёнах дзе кулак сабатуе збожжазагатоўкі і не атрымлівае рашучага адпору з боку мясцовых арганізацый. Кармянскі раён спагнаў цьвёрдыя заданьні толькі на 16,3 проц., Хойніцкі — 13,9 проц., Глускі — 22,7 проц., Дубровенскі — 14,3 проц. і г. д.

Неабходна рашуча ўзмацніць націск на кулацка-заможныя элементы, спыніць злосны сабатаж збожжазагатовак шляхам прыцягненьня да суровай адказнасьці кулакоў і заможнікаў, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў.

У бліжэйшыя-ж дні збожжазагатоўкі павінны быць завершаны. XVII Ўсесаюзная партканфэрэнцыя павінна быць адзначана канчатковай перамогай на гэтым фронце.

НА ДАСЯГНУТЫМ НЕСУПАКОЙВАЦЦА

ВІЦЕБСК.

XIV зьезд КП(б)Б калгасьнікі і аднаасобнікі — беднякі і сераднякі раду сельсаветаў **Віцебскага раёну** адзначаюць арганізацыйны чырвоных абозаў са збожжам, яльном і інш. прадукцыяй. За 5 дзён (з 16 па 20 студзеня) чырвонымі абозамі, арганізаванымі В. Лідчанскім, Сялюцкім, Рудніцкім, Міхалёўскім, Нікалаеўскім, Шумянскім, Рудакоўскім, Елагінскім і Машканскім сельсаветамі, здана па пункты Саюзхлеба 26,7 тон збожжа.

Калгасьнікі і аднаасобнікі Бараўлянскага і Даўжанскага сельсаветаў 19 студзеня здалі чырвоным абозам 10 тон збожжа, 3 тоны жывёлы, 1 тону 2 цнт. ільнанасеньня, 4 цнт. ільнавалакна і 7 цнт. воўны.

Калгас «Ясная паляна», Рудакоўскага сельсавету, поўнасьцю выканаў заданьні па ўсіх відах загатовак і ў падарунак 2-й гарпартканфэрэнцыі высунуў сустрэчныя плыны. У гэтым калгасе ўжо поўнасьцю разьмяркован ураджай на прынцыпе «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае».

На раёне ў цэлым за апошні час, у выніку ўзьдыму і мабілізацыі мас на баявое правядзеньне дэкадніка штурму, арганізацыі масавых чырвоных абозаў у адказ на адозву ўраваўніцкіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў, дасягнут рашучы зрух у збожжазагатоўках. Гадавы плян на 20 студзеня выкапан на 102,8 проц.

Аднак, збожжавую кампанію пельга лічыць скончанай, паколькі рад сельсаветаў і калгасаў яшчэ ня выканаў пляну здачы збожжа. Калгасы Рудакоўскага сельсавету: імя Сталіна, імя Чарвякова і імя Леніна значна адсталі. У гэтых калгасах ня скончана нават малацьба.

У паасобных калгасах моцна даюць сябе адчуваць месьніцкія, кулацка-рвацкія тэндэнцыі. Так, у калгасе імя Якаўлева, Шумянскага сельсавету, разьмеркаваньне даходаў праводзілася па кулацкім прынцыпе. Маючы выстарчальную колькасьць саломы, калгас дагэтуль не прыступіў да выкананьня заданьня па загатоўках. Праўленьне калгасу ня толькі не змагаецца з дробна - ўласніцкімі, рвацкімі тэндэнцыямі адсталых калгасьнікаў, але лўна патурае ім. «Я заяўляе старшыня калгасу,— раздам прадукцыю раней калгасьнікам, а пасьля буду выконваць плян».

Па гэтых тэндэнцыях трэба моцна ўдарыць.

Задача партарганізацыі Віцебшчыны — дабіцца ў бліжэйшыя-ж дні поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак усімі сельсаветамі, усімі калгасамі. Толькі тады можна будзе лічыць, што збожжазагатоўкі завершаны. Трэба больш рашуча змагацца з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі адсталых груп калгасьнікаў і даць рашаючы адпор кулацкім агентам, якія распальваюць гэтыя тэндэнцыі. **С. З.**

Буксірныя брыгады—у адстаючыя калгасы

КАПЫЛЬ. (НАШ КАР.).

КАЛГАС «ЛЕНІНЕЦ», КАПЫЛЬСКАГА РАЁНУ, ДАВІЦЦА ВЯЛІКІХ ПОСЬПЕХАЎ НА ЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ. ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА І ПОЎНАСЬЦЮ.

У АДКАЗ НА ЗАКЛІК КАЛГАСЬНІКАЎ І АДНААСОБНІКАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНУ, КАЛГАС «ЛЕНІНЕЦ» ВЫСУНУЎ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК У РАЗЬМЕРЫ 12 ЦНТ. КАЛГАСЬНІКІ «ЛЕНІНЦА» ВЫКЛІКАЛІ НАСЫЛЕЛАВАЦЬ ІХ ПРЫКЛАДУ ЎСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ І БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ—АДНААСОБНІКАЎ КАПЫЛЬШЧЫНЫ.

КАЛГАС «ЛЕНІНЕЦ» УЗЯЎ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ БУКСІР ДВА СУСЕДНІЯ КАЛГАСЫ: ІМЯ ЛАНШУЦКАГА (НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛЬСКІ) І **«ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК».** У ГЭТЫЯ КАЛГАСЫ НАКІРАВАНЫ ДЗЬВЕ БУКСІРНЫЯ БРЫГАДЫ.

ВАРЫВАЦКІ.

Сустрэчны—у гонар XIV партзьезду

ПЛЕШЧАНІЦЫ. (Па тэлефону).

Калгасьнікі, беднякі і сераднякі — аднаасобнікі Плешчаніцкага раёну адзначаючы XIV зьезд КП(б)Б чырвонымі абозамі са збожжам.

Калгасы Каменскага сельсавету здалі вышэй пляну з тоны збожжа і 2 тоны ільну.

У Ізяславім сельсавеце здана збожжа вышэй пляну 20,2 цэнт., а якіх калгасы здана 11,6 цэнт., адназабоўнікі—6,6 цэнт.

Сяльгорны Прусаўскага сельсавету свыш пляну здана ў гонар XIV зьезду збожжа 20 цэнт., бульбы—3 цэнт.

Калгас «Ільліч» па выкліку калгасу «Іскра» ў гонар зьезду выконуў сустрэчны плян па збожжы ў 5 цэнт. Сустрэчны плян выканан.

Калгас імя Сталіна, які быў самым адсталым, да XIV зьезду ліквідаваў зацягваньні дзяржаве і поўнасьцю выканаў плян па збожжазагатоўках. У гонар зьезду калгас здаў свыш пляну 5 цэнт. збожжа і 1,16 цэнт. ільнавалакна.

Гершман, Міхайлаў.

Харбін—у руках японскіх стаўленікаў

Становішча ў горадзе напружанае

ТОКІЕ, 26. «Сімбун Рэнга паведамляе з Харбіну, што **авангард войск генэрала Юй—камандуючага арміяй ураду Сі-Ся сёньня раніцою ўступіў у Фуцьзядзян (кітайская частка гораду Харбіну).** 26-ая брыгада, якая падпачальваецца генэралу Дзінчо, пачала эвакуацыю Харбіну.

Паводле слоў агенцтва, **становішча ў Харбіне напружанае** (ТАСС).

Генэрал Ма ў новай ролі

ТОКІЕ, 26. Сімбун Рэнга паведамляе з Харбіну, што мукдэнскі ўрад прапанаваў Чжан Цзін-гую (старшыня хэйлунцзянскага ўраду) заняць пасаду прэзыдэнта «незалежнай» Манчжурыі. Чжан-Цзін-гуй выяжджае ў Мукдэн. **Генэрал Ма,** паводле паведамленьня агенцтва, **назначаецца старшынёй ураду** (ТАСС).

Канстытуцыя для „незалежнай Манчжурыі“ сьпечана

МУКДЭН, 25. Паведамляюць з Дайрэну, што канстытуцыя «новай паўночна-ўсходняй дзяржавы» гатова. Новая дзяржава абвяшчаецца незалежнай ад уласнага Кітаю і будзе самастойна распараджацца мытнымі паступленьнямі, распрацуе ўласныя тарыфы і заключыць згоду з Японіяй аб пратэкцыяніскіх тарыфах.

Наплыў прадстаўнікоў японскіх банкаў і канцэрнаў

БЭЙПІН, 25. У Паўночную Манчжурыю прыбываюць прадстаўнікі японскіх банкаў і канцэрнаў з мэтай умацаваць эканамічныя пазіцыі Японіі. Маецца на ўвазе, што электрастанцыі ў Паўночнай Манчжурыі будуць кіравацца японскімі інструктарамі. У прыватнасьці японскае камандаваньне запрапанавала Паўдзіёва - Манчжурскай чыгунцы камандыраваць інструктароў для кіраўніцтва электра-прадпрыемствамі ў Цыцыкары. Будуць таксама ўжыты меры для пераходу электрастанцыі Харбіну ў рукі японцаў.

Генэрал Даіхара—начальнік ваеннай місіі ў Харбіне

БЭЙПІН, 25. Японская ваенная місія ў Харбіне **рэарганізавана і пашырана.** Адкрыты **рускія і кітайскія аддзелы.** Начальнікам місіі назначан **генэрал Даіхара.** У замежных колах адзначаюць выключную ролю Даіхара як «японскага Лаўрэнса» ў мукдэнскіх і цзянцзінскіх падзеях. Назначэньне Даіхара разглядаецца, як паказальнік парастаючай актыўнасьці японскіх ваенных колаў у Паўночнай Манчжурыі.

100.000 ДАЛЯРАЎ ЗА ГАЛАВУ ХО-ЛУНА

ШАНХАЙ Прадстаўнік Хубэйскага травінцыяльнага ўраду генэрал О Чэнь-чунь назначыў узнагароду ў **100.000 даляраў за галаву чырвонага камандзіра Хо-Луна,** кіруючага аперацыямі Чырвонай армії ў Хубэі.

КАТАВАНЬНІ ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ПОЛЬСКІХ ТУРМАХ

19-гадовую Штыфтэр 3 дні катавалі да страты прытомнасьці

ВАРШАВА, 22. Як паведамляе львоўская «Хвіля», на працэсе трох агентаў, абвінавачаных у збойстве палітзьняволеных, які адбываецца ва Львове, **выявіліся характэрныя факты збойстваў і катаваньняў палітзьняволеных у польскіх турмах.**

Паводле слоў газэты, палітзьняволеная 19-гадовая Штыфтэр заявіла, што пасьля арышту, ёй учуцілі галаву коўдрай, разьвялі дагала, прывязалі раменьнямі да лаўкі, а потым біті па пятках гумовымі палкамі. Гэта рабілі тры разы на працягу трох дзён. У трэці раз Штыфтэр прывязалі да крэсла, заткнулі рот анучамі, а ў нос прасунулі гумовыя трубкі, злучаныя з бутэлькай, напоўненай нейкай вадкасьцю. У выніку гэтага Штыфтэр страціла прытомнасьць і з ёй здарыўся нэрвовы прыпадак. Штыфтэр выбілі ў турме 3 зубы.

Такім-жа чынам былі катаваны, паводле слоў «Хвілі», палітзьняволеныя **Шаян, Экель, Умшвайр і Гай.**

Абвінавачаныя ня прызналіся заўважыўшы, што паказаньні арыштаваных іжжывыя і «выкліканы жаданьне адпомсьціцца з боку камуністаў». Справа была адкладзена на пяцёўны тэрмін.

Польская прэса аб парафіяваньні польска-савецкага пакту аб ненападзе

ВАРШАВА, 26. Усе газэты на відным месцы зьмяшчаюць тэлеграмы з Масквы аб парафіяваньні польска-савецкага пакту аб ненападзе, падаючы асноўны яго зьмест. Афіцыёзная «Газэта Польска», камэнтуючы парафіяваньне пакту, піша:

«Парафіяваны ў Маскве дагавор аб ненападзе паміж Польшчай і Савецкім Саюзам — спрыяючы крок наперад у напрамку ажыцьцяўленьня мірнай палітыкі, якая зараз вядзецца на Ўсходзе Эўропы. Уняцьценьне пакту ў жыцьцё сьвязана з заключэньнем аналёгічных пактаў усімі дзяржавамі, што мяжуюць на Захадзе з Савецкім Саюзам, што адпавядае пазыцыі Польшчы, а таксама іншых, мяжуючых з Савецкім Саюзам краін. Ад імя фінляндзкага ўраду гэта было выказана фінляндзкім міністрам замежных спраў Коскінэнам пры падпісаньні 21 студзеня ў Гэльсінгфорсе савецка-фінляндзкага пакту».

РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ Ў ГІШПАНІІ

Забастовачная хваля на ўздыме

МАДРЫД, 26. У Сэвільі пачалася ўсеагульная забастоўка. Жыцьцё гораду поўнасьцю паралізавана. Паліцэйскія ўлады занялі ў горадзе ўсе стратэгічныя пункты. Учора адбываліся сутычкі паміж бастуючымі рабочымі і жандармерыяй. Паранены 2 жандармы і 1 рабочы.

У Більбао адбываецца частковая забастоўка. У некаторых мясцовасьцях правінцыі бастуюць пагалоўна ўсе рабочыя. У Лёрыда і Алкой абвешчана ўсеагульная забастоўка. У Валенсіі пачалася забастоўка рабочых —транспартнікаў і будаўнічых рабочых. Бастуючыя рабочыя напалі на трамвай, перакулілі 2 вагоны. Забастоўшчыкі прабавалі разграміць майстэрню зброі. Шмат арыштаў сярод рабочых. У Кардоне пачалася забастоўка будаўнічых рабочых і шэталістаў.

У Мансэрад (правінцыя Валенсіі) бастуюць усе рабочыя. Бастуючыя рабочыя занялі муніцыпалітэт і падпалілі царкву. У Кастель-дэкадра (правінцыя Таррэль) бастуючыя рабочыя занялі дом муніцыпалітэту і спалілі ўсе дакументы і архівы, якія там знаходзіліся. **Потым рабочыя аўладалі парахавым склепам.** У гэты раён высланы войскі.

Губернатар Таррэльскай правінцыі загадаў закрыць **усе прафсаюзныя арганізацыі ў галоўным горадзе і 4-х буйнейшых пунктах правінцыі і арыштаваць кіруючых прафсаюзных работнікаў. У Алеканцы** пачалася ўсеагульная забастоўка. **У Малазе** рабочыя прабавалі выкваліць аднаго арыштаванага. Паміж паліцыяй і рабочымі завязалася страляніна. Адзін рабочы забіты і двое цяжка паранены (ТАСС).

„ТОЛЬКІ У СССР СЯЛЯНСКАЕ ПЫТАНЬНЕ САПРАЎДЫ ВЫРАШАНА КАНЧАТКОВА“

НА УСЕГЕРМАНСКІМ СЯЛЯНСКІМ ЗЬЕЗДЗЕ

БЭРЛІН, 25. На ўсегерманскім зьезьдзе працоўных сялян быў заслуханы даклад старшыні зьезду **Нау** аб выніках паездкі першай сялянскай дэлегацыі ў СССР.

Пры напружанай увазе ўсіх дэлегатаў Нау намаляваў карціну тагдашняга разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Параўноўваючы становішча сялянства ў Савецкім Саюзе са становішчам працоўных сялян Польшчы і Германіі, дакладчык прыйшоў да заключэньня, што нават аднаасобнікі, ня кажучы ўжо аб калгасьніках, **атрымліваюць больш вялікія даходы і маюць больш высокі жыцьцёвы ўзровень, чым сялянства памянёных капіталістычных краін.**

Дакладчык далей падрабязна спыніўся на посьпехах калектывізацыі ў СССР, у прыватнасьці ў раёнах з нямецкім насельніцтвам.

Старшыня кіраўніцтва ўбралійскага сялянскага камітэту — італьянец **Мільёлі** сказаў, што **«толькі ў Савецкім Саюзе сялянскае пытаньне сапраўды канчаткова вырашана».** Выступленьні некаторых кулацкіх адгалоскаў і, у прыватнасьці, аднаго палякі-сацыяліста патыгуліся на рашучы адпор усяго зьезду. (ТАСС).

НЯЎХІЛЬНА ПАВЫШАЮЧЫ ТЭМПЫ ІЛЬНАЗАГАТОВАК,

змагацца за высокія гатункі валакна

Палепшыць якасьць ільну

СНК БССР вызначыў рад важных мерапрыемстваў па паляпшэньні якасьці ільнавалакна. Белкалгаснэнтру і Райсаўгаснэнтру і іх сыстэме пад асабістую адказнасьць кіраўнікоў, прапанавана праверыць арганізацыю ўліку сыраду, які здаецца калгасьнікамі ў апрацоўку, паглядаючы за тым, каб сырцо для пераапрацоўкі выдавалася абвязкова на вагу. Устанаўляецца кантрольнае заданьне па якасьці і нормы выхаду доўгага і кароткага валакна, па якіх калгасьнікі павінны рабіць справаздачы ў атрыманым сырцу і здачы паклі.

Райсаюзы і МТС абавязаны вылучыць спэцыяльных асоб і ўскласьці на іх адказнасьць за апрацоўку ільну.

Белнарзакнапляводсаюз, Белаансаюз, Белтэкстыльабъяднаньне і Экспартрэсп павінны палажыць напрадні аглад гатовага валакна ў калгасах, арганізаваўшы тэхнічную дапамогу калгасам у справе апрацоўкі ільнавалакна, звяртаючы асаблівую ўвагу на стираную пратроўку яго, правільную падборку адпаведных жмень і падрэзку.

У асобных раёнах — Аршанскім, Віцебскім, Кармянскім, Чырвонапольскім, Жлобінскім, Крычаўскім, Слуцкім, Чэрыкаўскім, Бялыніцкім, Горацкім, Лёзьнянскім, Сураскім, Талочынскім, Чавускім, Шклоўскім і Дубровенскім, а таксама ва ўсіх мачанцовых раёнах забаронена прыёмка ільна-сырцу.

У іншых раёнах, дзе прыёмка ільна-сырцу дапускаецца, лён № 6 і вышэй, павінен здавацца ў трапаным выглядзе. У выключных выпадках дапускаецца прыёмка ільнасырцом з абавязацельствам загатоўшчыкаў дапрацаваць яго на сваіх прыёмных пунктах і базе.

Апрача выдачы авансаў і прэміі за паляпшэньне якасьці валакна ільну, СНК прапануе пры апрацоўцы налічваць дадаткова калгасьнікам, якія працуюць па сушцы, мяцьці і трапаньні ільну, у прададнёх 10 проц. выпрацоўкі за павышэньне якасьці валакна ад кожнага пумару.

Для стымулываньня трапаньня ільну, Наркамснаб Беларусі вылучае фонд хлеба і прамысловых тавараў.

Устанаўлена прагрэсіўнае стымуляваньне прамысловымі таварамі за здачу ільну і пялькі лепшай якасьці калгаснымі і бяднацка-серадняцкімі гаспадаркамі: за лён 10 пумару і пялькі 1-га гатунку ў сярэднім — 40 проц., а за лён 12 пумару і вышэй і пялькі адборнага гатунку ў сярэднім 45 проц. замест існуючай сярэдняй нормы 30 проц.

Адзначаючы слабую барацьбу з фальсыфікацыяй і псаваньнем ільну, СНК прапанаваў раённым выканаўчым камітэтам прыцягваць вінаватых да судовай адказнасьці.

Не затрымліваць адгрузку валакна тэкстыльным фабрыкам

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.).

На складах ільнабазы знаходзіцца каля 20 вагонаў трапанага, але непадвязанага ільну. З-за гэтага затрымліваецца яго адпраўка тэкстыльнай прамысловасьці.

Загадчык базы **Цюрэвіч** злачынна-нядбайна адносіцца да выкананьня сваіх абавязкаў. Ён па некалькі дзён не зьяўляецца на работу. Па віне Цюрэвіча на працягу двух тыдняў не праводзіліся разьлікі за прынятае ад райкаапсаюзу валакно ў колькасьці 114 тон.

Да падвязкі і прасаваньня ільну па базе адносіцца надзвычай нядбайна. Прасаваны лён валяецца пад адкрытым небам і не адгружаецца.

У захаваньні прадукцыі — поўная безгаспадарчасьць. Лён ужо апрацаваны, падвязаны і спрасаваны, у колькасьці 200 тон накладзен у агульную груду без сартаваньня. Пры яго разборцы атрымаецца ня менш 75 проц. разьвязі. Прасоўка робіцца слабая, кіпы атрымліваюцца вялікія. Замест 60 кіпаў, у вагон зьмяшчаецца толькі 30-32 кіпы. Адгрузка праводзіцца не па нарадах.

На дадамогу Касьцюковіцкай базе неабходна перакінуць кваліфікаваных работнікаў з іншых раёнаў. Склады павінны быць разгружаны неадкладна.

Своечасовая адгрузка ільну і забесьпячэньне тэкстыльнай прамысловасьці сырцом будзе лепшым падарункам 14 зьезду КП(б)Б.

М. Л.

Вопыт Воршы—усім раёнам

ВОРША. Цэнтральная ільнабаза ў ВОРШЫ паказвае прыклад арганізаванай работы. Лён, які паступае на базу, зараз-жа апрацоўваецца і без затрымываньня адпраўляецца па нарадах. За сьнежань плян адгрузкі перавыкананы. Заляжу прадукцыі няма.

Уся работа пераведзена на гаспадарчы разрахунак, зьдзельшчыну і вядзецца па-брыгадна, у 2 зьмены. Паміж брыгадамі заключаны дагаворы на сацспаборніцтва. Лепшыя ўдарнікі ў колькасьці 21 чал. за выкананьне і перавыкананьне вытворчых паказальнікаў, прэміраваны.

Работнікі Аршанскай ільнабазы вядуць растлумачальную работу ў калгасах і сельспанкуўтаварыствах па лепшай апрацоўцы ільнавалакна. Нада хапам сваёй базы, як цэнтральнай, зьяўляецца тое, што яна свой стаканчык вопыту не перанесла ва ўсе астатнія раённыя базы.

У ход работы 14 зьезду КП(б)Б работнікі Аршанскай базы пасьпяшны сваю працу ўзьняць яшчэ на больш высокую ступень, свой дадатны вопыт зрабіць сыстэмай работы ўсіх загатоўчых арганізацый. **К.**

ЦК УсеКП(б) з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці

тав. П. СТУЧКА

старэйшага бальшавіка, актыўнага дзеяча нашай партыі і Камінтэрну, рэвалюцыйнага барацьбіта за вызваленьне рабочай класы

Прэзыдыум ЦВК СССР з жалем паведамляе аб сьмерці

тав. П. СТУЧКА

якая пасьведавана 25 студзеня 1932 году

Да 60-годзьдзя т. М. А. Скрыпніка

Прывітаньне ЦК УсеКП(б)

Выпрабаванаму старому бальшавіку тав. Скрыпніку ў дзень яго 60-цігодзьдзя ЦК УсеКП(б) шле бальшавіцкае прывітаньне.

Прывітаньне ЦВК БССР

Прэзыдыум ЦВК БССР вітае вас, Мікола Аляксеевіч, з вашым 60-гадовым юбілеем, адзначае ў вашай асобе выпрабаванага, старога бальшавіка-ленінца, барацьбіта за сацыялізм, за генэральную лінію партыі, вялізарную вашу ролю ў справе практычнага вырашэньня нацыянальнага пытаньня ў СССР, стойкага змагара з правымі і „левымі“ ўхіламі. Прэзыдыум ЦВК БССР жадае вам многіх год жыцьця і работы.

Старшыня ЦВК БССР **А. Чарвяконў**

Сакратар ЦВК БССР **Гнілякевіч.**

АДКРЫЛАСЯ ЎСЕУКРАІНСКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПОЛЬСКІХ КУЛЬТАСЬВЕТНЫХ УСТАНОЎ

КІЕЎ, 25. Ва ўрачыстай абстаноўцы адкрылася **ўсеукраінская канфэрэнцыя польскіх культасьветных устаноў.**

У канфэрэнцыі прымаюць удзел 230 дэлегатаў — прадстаўнікоў польскіх сельсаветаў Украіны, польскіх калгасаў нацыянальнага польскага Мархлеўскага раёну, фабрык і заводаў гэтага раёну і г. д. У канфэрэнцыі прымае ўдзел адзін са старэйшых польскіх рэвалюцыянэраў тав. **Сахацкі.**

Канфэрэнцыю адкрыў нам. наркам асьветы Украіны тав. **Гірчак,** які адзначыў вялізарнейшыя посьпехі, дасягнутыя ў будаўніцтве нашай краіны пры актыўнейшым удзеле шырокіх мас нацменшасьцяй СССР.

— Канфэрэнцыя, — указаў Гірчак, — супала са знамянальным у гісторыі будаўніцтва польскай сац. культуры па Украіне моментам — **адкрыцьцём польскай вышэйшай навучальнай установы — інстытуту сацыяльнага выхаваньня.**

На Добрускай фабрыцы

ДОБРУШ. (Па тэлеграфу). 23 студзеня на добрускай фабрыцы «Герой працы» выпушчана 15.373 кгр. паперы, або 26,6 проц. сутачнага заданьня. Прастой трох машын складае 49 рабочых гадзін. Торфу падана 158 тон.

24-га студзеня выраблена 14.208 кгр. паперы, або 24,5 проц. сутачнага заданьня. Прастой трох машын складае 50 рабочых гадзін; торфу падана 157 тон.

25 студзеня выпушчана 30.628 кгр. паперы, або 52.8 проц. сутачнага заданьня. Прастой трох машын складае 22 рабочыя гадзіны; торфу падана 178 тон.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. Каса—зд 1 г. дня. Гукавы гаворачы фільм СНАЙПЭР.

„Інтэрнацыянал“ Мастацкі фільм ХТО ТЫ ТАКІР У гал. роль ИТОРАЎ І СУДАКЕВІЧ. КАСА—зд 1 гадз. дня.

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. Мастацкі фільм ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА Пачатак у 2 гадз.

„СПАРТАК“ чатак сэансаў: 7 г., 9 г. і 11 г. НІБЭЛУНГІ ў 2-х сэрыях 1-ая сэрыя ў 12 часам. КАСА—з 11 гадз. дня.

ТРЭСТ ЗЯЛЁНАГА БУДАЎНІЦТВА

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ЯМА ТАРАЎ САДОЎНІЦТВА, ЗАЦІКАЎЛЕНЫХ У НАБЫЦЬЦІ

ЦЬВЯТОЧНАГА НАСЕНЬНЯ,

што яны павінны паклапаціцца аб перасылцы сваіх заказаў у сучасны момант, каб ТЭС неў магчы пасьць водавозцаў іх патрабаваньні. Каталог зборнік выйдзе з друку ў студзеньні 1932 г. і будзе рассылацца ўсім жадаючым па іх патрабаваньні.

МОСКВА, Театральны проезд, 8, Коммерческая контора (Семенная базе).

Менскі ЦРК

даводзіць да ведама усяго незарганізаванага насельніцтва, што

ВЫДАЧА НАБОРНЫХ КАРТАК

праводзіцца з 23|I-па 1|II-32 г. ад 10 гадз. ран. да 5 гадз. вач.

Штодзення, па прынцыпе раёну міліцыі па наступных 4-х пунктах:

1-шы пункт—клюб саўгандальслужачых
2-й пункт—былая 33 крама па Цыроцкай вул.
3-ці пункт—Бабруйская вул. каля дравянога складу
4-ты пункт—клюб салотужнікаў па Рокоўскай вул.

Для атрыманьня наборных картак необходна прадставіць:
1) пайпчыкам—пашпарт, дамавую кнігу, матрыкі дзяцей, прамтаварныя і прадуктовыя карткі
2) непайпчыкам—дамавая кніга, пашпарт, матрыкі дзяцей прамтаварныя і прадуктовыя карткі

Усе іншае на сельніцтва, якое дае працу, атрымлівае наборныя карткі па месцы працы.

Праўленьне МЦРК

Беларускі Дзяржаўны Аўта-Дарожны Інстытут

абвяшчае ПРЫЕМ

НА ВЯЧЭРНІ РАБФАК

(3 курс і 4 курс—паскораны выпуск для досьвітага набору ў інстытут)—240 асоб.

Прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, батракі і беднякі па базе 7-ы і 8-годзі.

Абавязковыя дакументы: 1) камандыроўка адпаведнай арганізацыі, 2) завераная анкета, 3) аб стане фізычнай працы, 4) аб узросьце, 5) асьвеце, 6) аб стане здароўя, 7) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, 8) для сялян—акладны ліст аб с-г., падатку на 1930-31 г., калгасьнікаў адпаведны дакумант ад калгасу, саматужнікаў—аб падатку на 1930-31 г.

Іспыты для асоб, ня маючых адпаведнай адукацыі адбудуцца з 1-га па 5-е лютага г. г.

Заняткі пачнуцца з 15-II—32 г.

Дакументы дасылаць па адрасе: Менск, Інтэрнацыянальная № вул. д. 31, другі паверх (1-я сяньскае). Канцылярыя адкрыта з 8 г. да 10 гадз. вечара.

Прыём дакумантаў да 1-II—32 г.

Дэкан Рабфаку Воўк-Левановіч.

БЕЛКАНТОРА САЮЗПРАМКОРМУ

гэтым паведамляе, што

ня гледзячы на пастанову Наркамснабу ад 29 сьнежня 1931 г., надрукаваную ў газ. „ЗЬВЯЗДА“ аб прадстаўленьні Белканторы Саюзпрамкорму заяўкі на 1-ы квартал на фураж, і неадпаразрэзная папрадпаўкі, да гэтага часу Сьнаводтрэст, Белмяса, Беладзержсьпірт, Галоўдартрэс, Десбел, Беладзеясаюз, Менбуд, Зах. чыг. буд., МБВ чыг. буд., Зах. чыг. дар. буд., Беллесбжбуцсаюз, Саюзконі і інш. арганізацыі не прадставілі Белканторы Саюзпрамкорму сваіх квартальных заявак на 1-ю квадру 1932 г., такім чынам згодна гэтай пастановы памянёныя арганізацыі зьмыты з плянавага снабжэньня.

Пунктам Саюзпрамкорму і Райкаапсаюзам

прапануецца

з атрыманьнем на месцы газэты „ЗЬВЯЗДА“ з гэтай абвесткай сьмяцьвоўпуск фураму ўсіх відаў: сена, салому, авёса, вогрубаў і інш. па нарадах Саюзпрамкорму памянёным вышэй арганізацыям для іншага пераведзеньня.

Адначасова паведам. пастановы СНК СССР аб, што, згодна 17-XII-31 г. павінны зьявіцца ў Белканторы

САЮЗПРАМКОРМ у 3-хдзённы тэрмін

для заключэньня умовы на пастаўку фураму неступным арганізацыям: Сожбуд, Белдзелесчыгаваданаю, Шкляпрэся абъяднаньне, Дзяржкінзавод, Белсамрэтсаюз, Саюзрыба, Масьлатрэст, Саюзтранс, транспарт Беладзержспірту.

Упаўнаважаны праўленьня V-й „Саюзпрамкорму“ па БССР

СІДАРОВІЧ.

Усебеларуская канферэнцыя школ фэз

СЭКТАР ПРАМЫСЛОВАГА ПАВЕЛЬНІЦТВА, ШТО

скліканая на 27-го студзеня г. г.

ПЕРАНОСІЦЦА.

Аб дні скліканьня будзе паведамлена дадаткова.

Сэктар прамысловага павельніцтва ВСНГ БССР.

2-га студзеня ў 12 гадзін дня, у АГУЛЬНАЙ ЗАЛІ БАН (Ленінская 23/35, 2 паверх) адбудзецца

ПЛЕНУМ АКАДЭМІЧНАГА САВЕТУ

БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК.

Парадак дня:
1. Разгляд і зацьвярджэньне плянаў праці інстытутаў Акадэміі на 1932 год.
2. Аб масавай працы Акадэміі.
3. Разгляд і зацьвярджэньне сацумовы паміж Акадэміяй СССР.

Беларуская навукова - дасьледчая станцыя

„ГИПРОСЕЛЬХОЗ“

КУПЛЯЕ

або арэндуе

дамы, кватэры

ў гнах аў і прыватных дамаўласьнікаў.

З прапановамі просьба зьвяртацца: г. Менск, Широкая, 28. (на двары) дырэктару станцыі „Гипросельхоз“.

СТУДЭНТЫ, сканчаючыя Менскі, Бабруйскі і Дубровенскі рабфакі і выпускныя

ў вышэйшы

пэдагагічны інстытут,

павінны зьявіцца на заняткі 2-га ЛЮТАГА ў г. Менск (Університэцкі Гарадок, галоўны корпус, вышэйшы пэдінстытут, пакой № 231) і мець з сабой посьпісныя прыналежды (падушку, коўдру, мяшок для сенажнік, матрасцыню).

Дырэктар вышэйшага пэдагагічнага інстытуту РУДНІЦКІ.

Шэйнай ф-цы імя Крупскай

ПАТРЭБНЫ

ГАЛОЎНЫ МЭХАНІК

і наогул механікі, якія ведаюць шэйныя машыны.

Пэнсія па дагаворанась